С утра 17 августа наши позиции начала бомбить вражеская авиация. Затем противник провел мощную артиллерийскую подготовку. Немецкая пехота, поддержанная танками, перешла в атаку на правом фланге, между деревнями Семеновка и Свисток.

Ополченцы вместе с советскими воинами встретили врага дружным огнем. Здорово поработали артиллеристы. Атака захлебнулась. Гитлеровцы повторяли ее снова и снова, пока к концу дня им не удалось обойти наши фланги восточнее деревни Семеновка и юго-западнее деревни Руденец. На этом рубеже возникла угроза окружения...

Подтянув до полка пехоты, противник после авиационной и артиллерийской обработки наших позиций снова ринулся в атаку, стремясь рассечь полк на две части в районе станции Уза. Однако и эта атака провалилась. Оставив на поле боя несколько сожженных танков и бронетранспортеров, много убитых солдат и офицеров, гитлеровцы откатились назад.

К исходу 17 августа наступление противника было остановлено по всему нашему рубежу. Задачу дня полк выполнил. В ходе боя личный состав проявил мужество и отвагу. Особенно отличились пулеметчики И.Сусликов, Е.Щербаков, В.Маянц, разведчики Родомысельский, Г.Шахнович, командир взвода Н.Руденко, командир роты Двоскин, Парахневич, комиссар батальона А.И.Казимиров, командир 2-го батальона старший лейтенант Зельченко и другие.

В связи с тем, что возникла угроза окружения полка народного ополчения, командующий 21-й армией приказал отвести подразделения на запасной рубеж и занять оборону на линии противотанкового рва, что в 300 метрах севернее развилки железной и шоссейной дорог.

Первый батальон полка народного ополчения, а также караульные батальоны Н.С.Исаева и Беляева благополучно оторвались от противника и заняли намеченные рубежи. 2-й батальон полка оказался в более трудном положении. Когда он начал отходить, враг открыл мощный артиллерийский огонь, что внесло некоторое смятение в рядах ополченцев. Однако ответный огонь нашей артиллерии позволил подразделениям батальона развернуться в боевой порядок вдоль железнодорожной насыпи, что севернее поселка торфозавода. Попытка противника сбить их с этого рубежа потерпела неудачу. Гитлеровцы снова и снова поднимались в атаку, но каждый раз ополченцы второго батальона встречали их организованным огнем.

Примерно в 18—19 часов 18 августа враг, подтянув до двух батальонов из резерва, усилил их танками и при поддержке огня артиллерии снова нанес удар во фланг нашим войскам. На рубеже второго батальона врагу удалось приблизиться к железнодорожной насыпи. Уже стали слышны немецкие выкрики. Между тем ряды ополченцев сильно поредели, на ис-

ходе были боеприпасы. Положение создалось критическое. В этот момент комиссар батальона Н.Н.Кунцевич поднялся во весь рост и крикнул: «Товарищи! В атаку, за мной!». Раздалось мощное «Ура!», «За Родину!» — и все, кто мог держать оружие, с винтовками наперевес бросились в штыковую атаку.

Гитлеровцы были ошеломлены этим и начали отходить на исходные позиции. В это время воины батальона Н.С.Исаева внезапно нанесли по фашистам фланговый удар. Противник оставил много убитых и раненых, поспешно отступая на север. Воспользовавшись замешательством в стане врага, второй батальон южнее Семеновки соединился с батальоном Н.С.Исаева.

В этих боях ополченцы проявили массовый героизм, отвагу и самоотверженность.

Взвод под командованием мастера стеклозавода им. Ломоносова Соболевского на своем участке отбил все атаки противника. Здесь мужественно сражались командир отделения И.Д.Паладьев — член партии, рабочий С.К.Панечкин — член партии, беспартийные А.Н.Григорьев, В.П.Набок, Т.П. Маклаков, П.А.Голиков и многие другие.

Пулеметчик Плющ — молодой рабочий вагонного депо — метким огнем уничтожил десятки гитлеровцев. Ополченец Д.Подлобников, получив ранение, отказался покинуть позиции и продолжал вести огонь, пока атака фашистов не была отбита.

18 августа противнику были нанесены существенные потери в людях и боевой технике. Но и ополченцы многих не досчитались в своих рядах. В тот день героически погиб боевой комиссар батальона Н.Н.Кунцевич. В самую напряженную минуту боя он поднял батальон в атаку и был сражен вражеской пулей. Героическая смерть комиссара отдалась глубокой болью в сердце каждого бойца батальона и ожесточила их на беспощадную борьбу с врагами.

Нелегким был путь первого батальона в деревню Красное. Около 17 часов 17 августа он начал отход к деревне Роги. Но противник контролировал этот населенный пункт, и батальону пришлось повернуть значительно юго-восточнее, идти по болотистой местности, да еще в условиях полной темноты и вражеского артобстрела. Передвигаясь по болотам без топокарты и компаса, ополченцы легко могли заблудиться. К счастью, в 3-й роте оказался боец, хорошо знавший эти места. То был Яков Иванович Петров, старый коммунист, штурмовавший Зимний дворец и участвовавший в гражданской войне. Теперь Я.И.Петров мужественно сражался в рядах ополченцев. Он точно вывел батальон в назначенный пункт — в деревню Красное.

В те дни отважно действовали и ополченцы 3-го батальона. Вот лишь один эпизод. На правом берегу реки Сож, в районе Давыдовки, что в 6 километрах южнее Гомеля, неожиданно появилась рота фашистов и пыталась переправиться через реку. Ополченцы вовремя обнаружили противника и ружейно-пулеметным огнем заставили его залечь. Новые попытки гитлеровцев переправиться через реку также были сорваны.

В деревне Красное первый батальон пробыл весь день. Бойцы отдохнули, а в 19 часов 18 августа по приказу командира полка 2-я и 3-я роты вместе со спецподразделениями выступили маршем в район деревни Прудок. Первую роту ранее направили в район Поколюбичи — высота с отметкой 151,4.

К 22 часам батальон достиг указанного пункта. Командиров встретил военный в звании майора, по национальности грузин. Фамилия его была, кажется, Джахуа. Вместе с ним здесь были капитан Иванов и еще несколько командиров. Майор заявил, что батальон поступает в его подчинение, и вместе с командиром батальона отправился на рекогносцировку района обороны. Там же майор поставил задачу: 1-му батальону во взаимодействии с батальоном капитана Иванова оборонять район деревни Прудок (второй ротой) и высоту с отметкой 151,4 (третьей ротой). Справа занял оборону батальон капитана Иванова, а слева — воинская часть под командованием подполковника Маневича.

Во время рекогносцировки майор Джахуа сообщил товарищам из 1-го батальона печальную весть о судьбе командира полка народного ополчения капитана Ф.Е.Уткина. Находясь в боевых порядках рот при отражении атаки противника, он получил смертельную рану.

Около 6 часов 19 августа враг открыл по позициям первого батальона артилле-

рийский и минометный огонь. Затем налетела авиация. Сразу же после бомбового удара последовали атаки пехоты и танков противника на всей линии нашей обороны. В каждой атакующей цепи было примерно 600—700 человек и 15—20 танков и бронемашин.

Красноармейцы и ополченцы героически защищали каждый метр родной земли. Но силы были неравные. Противнику удалось вклиниться в нашу оборону и почти отрезать 3-ю роту, находившуюся на высоте 151,4. Ей пришлось спешно отходить. Гитлеровцы тут же открыли фланговый артиллерийский и пулеметный огонь. Ополченцы были вынуждены залечь на невыгодных позициях — южных скатах высоты. В целях оказания помощи 3-й роте по команде комиссара батальона А.И.Казимирова 2-я рота поднялась в контратаку, нанося удар во фланг атакующей пехоте противника. Однако контратака успеха не имела.

Вскоре на позиции 1-го батальона народного ополчения прибыло подкрепление — батальон мотопехоты с танками 219-й моторизованной дивизии. При поддержке пяти танков совместно перешли в контратаку. Противник, понеся существенные потери, отступил. Так было разорвано кольцо окружения 3-й роты и восстановлена наша оборона на прежнем рубеже.

В 11 часов 19 августа от капитана Иванова последовало распоряжение — 1-му батальону полка народного ополчения передать рубеж обороны батальону 219-й моторизованной дивизии, подобрать раненых, оружие, захоронить погибших и сосредоточиться в южной части деревни Прудок. Сюда прибыл начальник АХЧ полка М.А. Маев. С ним было семь грузовых автомашин. Быстро собрали оружие, раненых эвакуировали в Ново-Белицу. Затем захоронили погибших бойцов батальона на местном кладбище (их было около 80, а раненых — несколько больше). В строю, не считая командования и хозвзвода, осталось 111 человек.

Ополченцы 1-го батальона на автомашинах отправились в лес за Ново-Белицу, по черниговскому шоссе. Командовали колонной капитан Иванов (начальник боевого участка) и комиссар батальона А.И.Казимиров. Около 14 часов 19 августа колонна прибыла к месту назначения.

В то время, когда бойцы первого батальона отходили на Чернигов, 3-й батальон был снят с позиций и расформирован. Часть людей передали в состав вновь создаваемого сводного полка 219-й моторизованной дивизии 67-го корпуса; 35 человек, в том числе командир, комиссар и начальник штаба батальона Г.И.Климович, П.А.Бас, К.Ф.Шаров, а также политрук Г.Н.Эркин, комроты В.Зыков, командиры взводов С.М.Гликер, Г.А.Штейнбах и другие ушли по указанию партийных органов на базы партизанских отрядов.

Отбор людей был произведен также из 1-го и 2-го батальонов. В последующем эти кадры вошли в состав партизанских отрядов и продолжали борьбу в тылу немецко-фашистских оккупантов.

Многие гомельские ополченцы сражались в рядах Красной Армии. Так, секретарь партийного бюро ополченческого батальона Н.К.Козунов был направлен в 122-ю отдельную стрелковую бригаду 73-й стрелковой дивизии 48-й армии, в составе которой участвовал в битве под Москвой, на Курской дуге, в боях за освобождение Гомеля и Гомельщины, Белоруссии, Польши. Он закончил свой боевой путь после Берлинского сражения на Эльбе.

Необходимо отметить мужество ополченцев. Назовем лишь некоторых отличившихся: командир 2-го батальона В.Я.Фридман, член партии с 1917 г., участник гражданской войны; командир роты ополченцев П.М.Дергач, член партии с 1917 г., тоже участник гражданской войны; командир роты Д.Г.Леоненко, член партии с 1939 г., воспитанник детского дома, участник боев на озере Хасан и на реке Халхин-Гол; начальник штаба 2-го батальона майор Финашкин, который после боев за Гомель продолжал отважно сражаться с немецкими оккупантами и был удостоен многих правительственных наград.

Советский народ никогда не забудет ратные подвиги ополченцев — командира роты Лангера, санитарки Двоскиной, Федина и других героев. А.М.Федин — член партии с 1917 г. — мужественно сражался в 1-м батальоне народного ополчения, а затем вступил в ряды Красной Армии. Он был удостоен правительственной награды за боевые отличия в гражданской войне — ордена Красного Знамени. В кровопролитном бою с гитлеровцами под Во-

ронежем А.М.Федин пал смертью храбрых.

Навсегда останутся в памяти народной бойцы и командиры полка народного ополчения, павшие смертью храбрых в боях при обороне родного города. В числе их командир полка капитан Ф.Е.Уткин, комиссар 2-го батальона Н.Н.Кунцевич, командир комендантского взвода И.В.Мигай, помначштаба полка Войтекун, медицинская сестра Р.С.Школьникова, ополченцы Н.В.Князева, Снигирев, пулеметчики С.М.Станкевич, В.А.Залужный и многие другие.

Гомельский полк народного ополчения с честью выполнил поставленную ему задачу. Своим мужеством и отвагой ополченцы внесли ощутимый вклад в дело разгрома гитлеровских полчищ и покрыли себя неувядаемой славой.

Друкуецца па кн.: В грозные годы. Воспоминания участников борьбы против немецко-фашистских оккупантов на территории Гомельской и Полесской областей. Мн., 1973. С. 79—87.

Бой на досвітку

З успамінаў Героя Савецкага Саюза В.Рашэтнікава

— Есть у белорусской деревни Прибытки в небольшой рощице старое кладбище. Там, под белыми березами, лежит мой друг — боевой летчик-истребитель лейтенант Леонид Мальцев, — рассказывает Герой Советского Союза, заслуженный военный летчик СССР генерал-полковник авиации В.Решетников. В то его последнее раннее утро 14 июля 1941 г. он смело вступил в бой с группой фашистских бомбардировщиков. Прикрывавшие ее «мессеры» прозевали тот миг, когда советский истребитель стремительно врезался в строй пятерки «юнкерсов», выходивших на боевой курс. Один был снят с ходу с нашего неба. Досталось, кажется, еще одному. Остальных разогнал. На цель никто не вышел. Бомбы сбросили, кто куда смог.

Но и сам Мальцев со своим МиГ-3 был насквозь прошит длинными очередями турельных пулеметов. Как он дотянул до своего аэродрома, никто не знает. И уже почти на минимальной высоте выравнивания, перед посадочной полосой, когда были убраны обороты мотора, «миг» клюнул носом, перевернулся через крыло и ткнулся в землю. Лететь он больше не мог.

Летчика извлекли из обломков всего в пулевых ранах. В одном из сохранившихся документов того времени полковой кадровик записал точно: «Убит в воздушном бою». Мальцев, кажется, уже мертвым привел машину на свой аэродром. В бортовом оружии не осталось ни одного патрона.

О том бое и гибели друга я узнал в декабре 1941 г. На каком-то фронтовом аэродроме. Наш общий товарищ, летчик из того же полка, рассказал мне об этом вылете в общих чертах: дрался, сбил «юнкерс», а потом пошел на посадку и разбился. Вот и все.

Прошло много лет. Что нового могли дать поиски каких-то недосказанных подробностей? И был ли в них смысл?

Мы очень дружили в Ворошиловградской школе военных летчиков, куда нас, рабфаковских студентов, зачислили по комсомольскому спецнабору в 1936 году...

Учился Леонид в высшей степени старательно: много читал, что-то записывал, запоминал. Любил работать на самолете, часто засиживался в кабинах истребителей. Летал хорошо, уверенно и на исходе учебы И-16 освоил прочно. Короткие курсантские вечера были наши: библиотека, зрительный зал, спортплощадка. Правда, я больше наблюдал за спортивными баталиями, чем играл. А Леонид толк в спорте знал: у него был даже какой-то чемпионский титул по боксу.

В 1938 г. мы окончили школу и вскоре получили назначения: он — в Западную Белоруссию, в истребительный авиационный полк, я — в Орел, в скоростной бамбардировочный. Писали друг другу редко, а когда оба сменили места службы, переписка и вовсе оборвалась. Время было тревожное, напряженное — не до писем.

Потом война. В начале августа 1941 г. прочел Указ о награждении лейтенанта Мальцева Леонида Васильевича за мужество и доблесть, проявленные в боях с фашистскими захватчиками, орденом Крас-

ной Звезды. Провоевал он с начала войны всего три недели. Еще до гибели был представлен к награде. На его боевом счету уже были сбитые самолеты, не считая того, последнего.

Память о друге не затухала. И сравнительно недавно я все же попросил найти учетную карточку лейтенанта Мальцева. Неожиданности следовали одна за другой.

Оказалось, он похоронен на кладбище знакомой мне деревни. Попросил товарищей из ближайшего гарнизона узнать, не сохранилась ли его могила. Выяснили — цела. Немного просела, но цела. Деревенские жители, годами постарше, помнят его последний бой, похороны поздним вечером того же дня, деревянный, наспех сколоченный обелиск с красной звездой. Полк вскоре ушел. Пришли оккупанты. Заглянули и на кладбище. Звезду с обелиска сняли. Однако после изгнания фашистов люди восстановили все заново.

Сейчас могила ухожена, обнесена оградой, на ней стоит памятник. На плите — полное имя героя, звание, даты. На могиле цветы, а по праздникам сюда приносят венки.

Авиация и космонавтика. 1981. № 7. С. 22—23.

На подступах да Гомеля

З успамінаў былога камандзіра асобнай батарэі Анатоля Піліпавіча Свярдлова

Первые дни Великой Отечественной... 172-я стрелковая дивизия, в которой я служил помощником начальника связи 340-го артиллерийского полка, передислоцировалась в район Могилева. После тяжелых оборонительных боев дивизия получила приказ: оставить Могилев, прорвать вражеское кольцо окружения и соединиться с советскими войсками.

В первых числах августа я с товарищами вышел из окружения в 40 километрах северо-западнее Чечерска (Гомельская область). А в середине августа был назначен командиром отдельной армейской артиллерийской батареи, занимавшей боевые позиции севернее Гомеля. У нас имелось пять 76-миллиметровых орудий, четыре трактора и автомашина. Личным составом батарея была укомплектована по штату. Часть красноармейцев уже воевала.

Обстановка была сложной — противник превосходящими силами пехоты и танков при поддержке авиации прорвал нашу оборону и углубился до рубежа Ветка, Лопатино, Семеновка, станция Уза, Руденец. Советские войска вели упорные оборонительные бои. Задача моей батареи состояла в том, чтобы не допустить прорыва танков на своем участке.

Батарея занимала позицию юго-западнее Семеновки. Южнее и впереди находилась зенитная артиллерийская батарея, которая прикрывала шоссе на Семеновку. Она имела орудия 85-миллиметрового калибра.

16 августа завязались упорные бои. Пехота противника при поддержке танков и бронемашин, под прикрытием сильного огня артиллерии и минометов предприняла атаки на рубеже Семеновка, станция Уза, Руденец. Однако дружными действиями наших стрелковых и артиллерийских подразделений эти атаки были отражены. К вечеру враг еще раз пытался перейти в наступление. Но оно также оказалось безуспешным.

С утра 17 августа гитлеровцы ввели в бой на гомельском направлении две новые дивизии — пехотную и кавалерийскую. После артиллерийской подготовки танки и пехота противника ринулись в атаку. Но и на этот раз фашисты встретили организованное сопротивление. Вражеские цепи здесь вынуждены были залечь.

К вечеру противник продвинулся в сторону Гомеля с северо-востока и северо-запада. Учитывая угрозу окружения советских войск на рубеже Семеновка, станция Уза, Руденец, командующий 21-й армией приказал с наступлением темноты нашей группе частей и подразделений, которой командовал подполковник Маневич, отойти на рубеж Костюковка, Красное. Моя батарея отошла вечером и заняла позиции, подготовленные заранее в деревне Еремино.

18 августа начались упорные бои почти на всем оборонительном рубеже. Но наиболее ожесточенные сражения происходили в районе Ветка, Лопатино, Урицкое. Поэтому мою батарею несколько раз перебрасывали то в сторону Лопатино, то в сторону Костюковки для поддержки отдельных подразделений из группы подполковника Маневича. И всюду войска, сдерживая натиск противника, постепенно отходили к Гомелю.

Во второй половине дня 19 августа моя батарея оказалась в очень тяжелом положении. Подразделения, действовавшие рядом, отошли без предупреждения. А мы, артиллеристы, продолжали отражать атаки противника. Вражеская пехота численностью до двух батальонов приблизилась к позициям батареи. После короткого огневого налета она ринулась в атаку. Так как поблизости не было наших стрелковых подразделений, возникла страшная угроза захвата батареи врагом. Мы решили сражаться до последнего снаряда. Подпустили вражескую пехоту приблизительно на 100 метров. Тогда я подал команду: «Всем орудиям прямой наводкой, картечью, залпом — огонь!» Залпы повторили несколько раз. Так батарея уничтожила много живой силы противника.

Но все же пришлось отойти. Батарея заняла позиции на северной окраине Гомеля. Мы еще не успели как следует оборудовать новый рубеж, а в воздухе уже появилось до 20 вражеских бомбардировщиков. Приблизившись к району наших прежних позиций, немецкая авиация яростно дважды их пробомбила. Значит, мы своевременно отошли, завели противника в заблуждение: Сколько было у нас тогда радости и восторга от этой победы над врагом. Личный состав батареи сразу приободрился, почувствовал, что бить гитлеровцев можно. Наш воинский коллектив стал еще более спаянным, смелым, начал действовать активнее.

После этого батарея вела огонь по немецким машинам, которые скопились в Поколюбичах и южнее реки Сож, а также по аэростатам врага, нахально поднимавшимся в воздух. Несколько таких аэростатов сбили наши орудия.

По приказу командования 21-й армии я перевел батарею в глубь города. Позиции заняли в районе, где сейчас находится стадион. Задача состояла в том, чтобы обеспечивать переправу через реку Сож наших отходящих войск, не допустить прорыва танков и пехоты противника в районы переправ (к Киевскому спуску и к речному порту). Правее батареи действовали другие наши подразделения.

Уже наступило 20 августа 1941 г., а наши войска еще продолжали переправляться с правобережной части Гомеля в район Ново-Белицы. Орудия батареи мы начали переправлять около двух часов ночи 20 августа. Сам переправился с последним орудием. Это было около трех часов ночи.

На левобережье батарея заняла новые позиции с задачей сорвать форсирование противником Сожа, поддерживать бой подразделений 219-й моторизованной дивизии, оборонявших район Ново-Белицы. Эту задачу мы выполняли 20, 21 и 22 августа. Ново-Белицу я оставил на рассвете 23 августа 1941 г. Дальнейшее нахождение там было невозможно, ибо враг мог захватить орудия.

Батарея отошла в лес, что в стороне от дороги на Чернигов. Гитлеровцы это заметили и немедленно открыли огонь. В дальнейшем мы отходили на юго-восток.

Примерно около 10 часов 23 августа 1941 г. я был тяжело ранен осколком снаряда в голову. Меня доставили в госпиталь на станцию Бахмач.

В заключение хочу сказать, что за отвагу, проявленную личным составом в оборонительных боях в районе Гомеля, многие воины батареи были представлены к правительственным наградам. Этим подразделением я командовал всего десять суток. Но это короткое время, может быть, следовало бы приравнивать к годам... Все наши воины показали себя верными сынами Советской Родины, отважными и умелыми ее защитниками.

Друкуецца па кн.: В грозные годы. Воспоминания участников борьбы против немецко-фашистских оккупантов на территории Гомельской и Полесской областей. Мн., 1973. С. 88—91.

Апошні бой салдата

Жнівень 1941 г. Бушавала крывавае полымя вайны. Савецкія воіны мужна абаранялі Гомель, адбіваючы атакі гітлераўцаў. Асабліва жорсткі бой завязаўся каля вёскі Касцюкоўка Яромінскага сельскага Савета. У адным са стралковых падраздзяленняў самаддана змагаўся супраць ворага хлопец з Чарнігаўшчыны Аляксей Скідан. Ад яго трапных выстралаў не адзін дзесятак гітлераўцаў знайшоў сабе смерць. Той бой 19 жніўня 1941 г. для Аляксея быў апошнім. Асколкам варожага снарада яго смяротна параніла ў грудзі. Праз некалькі гадзін фашысты занялі вёску. Жыхар яе, Мікалай Васільевіч Гаўрыленка, непадалёк ад свайго дома, дзе абаранялася група савецкіх байцоў, заўважыў загінуўшага маладога салдата. Побач ляжала вінтоўка, некалькі падсумкаў, дзве гранаты і каля 50 стрэляных гільзаў. А за 15—20 м ад яго ляжалі забітыя гітлераўцы.

Каля спускавога курка вінтоўкі Гаўрыленка знайшоў скручаны ў трубачку лісток з блакнота. Няроўнымі радкамі на ім былі напісаны апошнія словы абаронца Гомеля: «Табе, Радзіма, я аддаў усё, што мог. Я паміраю, прашу, хто знойдзе маю запіску, няхай перадасць маім родным, што я стаяў насмерць. Не здамся жывым ворагу. Скідан».

Помнік П.М.Пастухоўскаму.

Непадалёк былі немцы, і Гаўрыленка спяшаўся пахаваць героя-байца. Мікалай Васільевіч выкапаў тут жа магілу, і беларуская зямля, за якую ўкраінскі хлопец аддаў сваё жыццё, прыняла яго з усёй зброяй.

Ішлі гады. Наступіў май 1965 г. Рыхтуючыся да свята Перамогі, вучні збіралі матэрыял аб удзельніках Айчыннай вайны. Свайму сыну Анатолю М.В.Гаўрыленка паведаміў пра воіна, які загінуў каля іх дома. Дзеці звярнуліся ў ваенкамат і напісалі пісьмо родным А.Скідана. 22 мая 1965 г. у в. Касцюкоўка, за якую змагаўся і загінуў смерцю героя ўкраінскі юнак, прыехала яго маці — Валянціна Ігнатаўна. Жанчына ў вайну страціла не толькі сына, але і мужа. Жыхары вёскі сустрэлі яе сардэчна, хлебам-соллю. Каля магілы Аляксея ёй расказалі, як ён храбра змагаўся з ворагам. Труну з астанкамі воіна перавезлі ў в. Пакалюбічы, дзе пахавалі ў брацкай магіле разам з іншымі загінуўшымі абаронцамі Радзімы. На мітынгу прысутнічалі сотні людзей. Усе, хто выступаў, выказалі маці Аляксея Скідана вялікую ўдзячнасць за тое, што яна выхавала дастойнага сына. На брацкай магіле, дзе пакоіцца прах Аляксея Скідана, заўсёды кветкі, як знак павагі да тых, хто цаной свайго жыцця абараніў свабоду і незалежнасць Айчыны.

С.Селюкоў.

ПЁТР МІХАЙЛАВІЧ ПАСТУХОЎСКІ

Пётр Міхайлавіч Пастухоўскі нарадзіўся 25 чэрвеня 1905 г. у горадзе Вялікія Лукі Пскоўскай вобласці (Расія) у сям'і чыгуначніка. Пасля заканчэння школы выбраў шлях бацькі — працаваў на мясцовым паравозарамонтным заводзе. У 21 год уступіў у партыю. Пасля прызыву ў армію — інструктар палітаддзела брыгады, выкладчык гісторыі КПСС, адказны сакратар парткамісіі Харкаўскага бранятанкавага вучылішча.

...У жніўні 1941 г. у час цяжкіх абарон-

чых баёў у раёне Клімаўка — Зябраўка батальённы камісар П.М.Пастухоўскі замяніў цяжка параненага і кантужанага камандзіра 12-га асобнага матацыклетнага палка 219-й матарызаванай дывізіі 21-й арміі Цэнтральнага фронту. Ноччу ён атрымаў загад выбіць немцаў з занятых імі пазіцый, каб даць магчымасць прайсці па чыгункі апошняму саставу з важным грузам з Навабеліцы на ўсход.

22 жніўня на досвітку пасля старанной разведкі П.М.Пастухоўскі падняў полк у атаку. Завязаўся няроўны бой, у ходзе якога батальённы камісар 25 жніўня быў смяротна паранены. Аднак баявая задача была выканана.

...Прах П.М.Пастухоўскага быў перанесены ў вёску Калініна і пакоіцца побач з магілай Героя Савецкага Саюза М.М.Куюкова. На гранітным абеліску надпіс: «Сыну Отечества, чей прах покоится на земле Гомельщины».

У Гомель прыязджалі жонка П.М.Пастухоўскага, якая зараз жыве ў Львове, і сын Пятра Міхайлавіча — генерал-лейтэнант Генадзь Пятровіч Пастухоўскі.

Матэрыялы аб жыцці і подзвігу героя збіралі навучэнцы Клімаўскай васьмігадовай школы і члены групы «Пошук» гомельскай СШ N 30.

Ул. Лырыёнаў.

У глыбокі тыл

З успамінаў Івана Іванавіча Пічукова

На рэдкасць прыгожы чэрвень пераваліў за другую палову. Для нас, дзевяцікласнікаў Урыцкай сярэдняй школы, падыходзілі да канца экзамены. 20-га чысла здавалі самы апошні прадмет — нямецкую мову. А праз дзень...

Аб тым, што пачалася вайна, мы даведаліся толькі пасля апоўдня 22 чэрвеня. У нашай вёсцы радыё не было. І тую страшэнную вестку прынеслі з Гомеля калгаснікі, якія ездзілі на падводах або хадзілі ў горад на базар.

Мы, падлеткі, неяк адразу пасталелі. Ужо вечарам таго першага дня адбыўся мітынг каля школы. А праз лічаныя дні сотні жыхароў сельсавета — калгаснікі, моладзь, падлеткі, старыя, жанчыны, дзяўчаты — ужо ўключыліся ў стварэнне абарончых збудаванняў. Усе, хто мог трымаць рыдлёўку, капалі супрацьтанкавы роў на падыходзе да вёскі Заліп'е з Урыцкае, з заходняга боку. Пазней нас, групу старшакласнікаў, разам з некалькімі калгаснікамі накіравалі з сякерамі і піламі ў лес за вёску Прыбар. Там мы рабілі супрацьтанкавыя завалы, якія цягнуліся шырокай паласой. Спілоўвалі дрэвы, пакідаючы высокія пні — у грудзі чалавека.

З ліпеня да савецкага народа звярнуўся па радыё Сталін. Тэкст яго выступлення я прачытаў у абласной газеце «Гомельская праўда». Асабліва ўрэзаўся ў памяць заклік: нічога не пакідаць ворагу на тэрыторыі, якой пагражае акупацыя. А ўжо было відавочна, хоць і не верылася, што нашым мясцінам не пазбегнуць такога лёсу. Запомнілася на ўсё жыццё тое выступленне яшчэ і таму, што мой бацька Іван Антонавіч Пічукоў, член праўлення калгаса, адразу добраахвотна выклікаўся ўзначаліць эвакуацыю кароў, цялушак старэйшага ўзросту і авечак у глыб краіны. Для суправаджэння і догляду жывёлы падабраў групу такіх жа добраахвотнікаў.

Па-першае, патрэбны былі даяркі. Імі сталі маладыя дзяўчаты, якія моцна сябравалі: Таня Сухаркова, Моця Каралёва, што працавалі на ферме цялятніцамі, і Гаша Кацуба з паляводчай брыгады. Тані было тады 18 год, Моці — 20, а Гашы, якую ласкава называлі ў вёсцы Зорка, споўнілася 23. Былі яны бойкія, шустрыя і вясёлыя — амаль самыя прыкметныя і аўтарытэтныя дзяўчаты на вёсцы. Ніводная вечарынка або гулянка моладзі не абыходзілася без іх удзелу. Любілі яны і спяваць, і скакаць пад гармонік, прытым абавязкова з вясёлымі і задзірыстымі прыпеўкамі. Словам, радаваліся жыццю, сваёй маладосці. І вось раптоўна ўсё гэта абарвалася...

Па-другое, неабходны былі паганятыя статка, якія адначасова выконвалі б і ролю пастухоў. У тым доўгім шляху і на новым месцы жывёла існавала выключна на падножным корме. Так што справа для тых, хто згадзіўся гнаць жывёлу ў далёкі тыл, была не з простых. Адным з іх быў васемнаццацігадовы юнак Аляксей Куцікаў, які працаваў да гэтага конюхам у брыгадзе бацькі. Іван Міронавіч Казлоў, 1888 года нараджэння, калгасны ветэрынар, таксама

ўвайшоў у гэту каманду. У нялёгкі і невядомы шлях ён узяў на падмогу малодшага сына Мішу, якому было ўсяго 11 гадоў.

Зборы былі нядоўгія. Тры фурманкі запрэглі парамі коней. Калгас выдзеліў на дарогу прадукты.

Адна з удзельніц эвакуацыі жывёлы Матрона Яўхімаўна Каралёва роўна праз 54 гады, расказваючы пра той рэйд у глыб краіны, зусім проста адказала на пытанне, як яна развітвалася з домам: «Сабралася і пайшла, а бацькі плакалі. Было гэта ў пятніцу. Рушылі ад фермы гадзіны ў чатыры дня. Адна фурманка спераду, а дзве — ззаду. Гналі жывёлу ўскрай дарог».

Так у сонечны спякотны дзень пачаўся той маршрут на ўсход, выкліканы страшэннай вайной. Першым населеным пунктам была вёска Лешчынец. Потым Гомель, Навабеліца, Добруш...

Дзяўчаты даілі кароў па тры разы на дзень. На даенне і начлег спыняліся ў тых месцах, дзе шмат было травы, звычайна каля рэчак, каб можна было і напаіць жывёлу.

З Арлоўшчыны шляхі-дарогі прывялі вандроўнікаў у Курскую вобласць. Там у абласным цэнтры жывёлу здалі на мясакамбінат.

17 жніўня 1941 г. усе сямёра вярнуліся ў родную вёску. А 19 жніўня, на Спаса, у вёску Заліп'е ўступілі немцы. Прама пад носам акупантаў мой бацька паспеў схавацца ў лесе. Па папярэдняй дамоўленасці за ім заехалі на фурманцы старшыня калгаса з вёскі Краснае Фёдар Фралоў і брыгадзір з Яроміна Багданаў. Толькі яны ад'ехалі ад хаты, якая знаходзілася на ўсходняй ускраіне вёскі, як некалькі адступаючых чырвонаармейцаў з вінтоўкамі пераскочылі цераз пералазкі нашага агарода і пабеглі па мяжы, а далей праз балота накіроўваліся ў хвойнік. І раптам штосьці засвістала ў паветры. Гэта з процілеглага канца вёскі ляцелі міны з нямецкіх мінамётаў. Адзін за адным пачуліся выбухі на агародах, у дварах. Адна міна ўзарвалася на нашым прысядзібным участку, другая — на суседскім агародзе паблізу нашай хаты, асколкі пашчапалі сцяну трысцена. Праз некалькі дамоў ад нас у сваім садзе загінулі старыя Захар Астапенка і яго жонка Лізавета. У каго забіла карову, каму разваліла хлеў...

Пачаліся змрочныя, чорныя дні фашысцкай акупацыі. Што гэта такое, наша сям'я зведала самая першая ў вёсцы.

Позняй восенню 1941 г. карнікі па даносе здрадніка-старасты схапілі майго бацьку, які тайком прыйшоў дамоў. Відаць, за хатай сачылі. Бацька быў першым у вёсцы, каго расстралялі акупанты.

Па-рознаму склаўся лёс іншых людзей, якія разам з бацькам ратавалі калгасны статак. Моцю Каралёву, напрыклад, гітлераўцы схапілі, калі яна летам 1943 г. адправілася з дому на пошукі партызан. Трапіла ў канцлагер, адкуль з дзвюма жанчынамі (мінчанкай і ленінградкай) ёй удалося ўцячы. Хаваліся на незнаёмай тэрыторыі, пакуль не прыйшлі савецкія воіны. Моця пайшла добраахвотна служыць у Чырвоную Армію. Спачатку была швачкай у ваеннай майстэрні, а затым перайшла ў групу нарыхтовак, якая забяспечвала франтавікоў прадуктамі харчавання. Дзень Перамогі сустрэла далёка ад роднай вёскі. Аб гэтым напамінае адзінае ўцалелае пасведчанне да медаля «За вызваленне Прагі». Пасля дэмабілізацыі М.Я.Каралёва працавала ў калгасе.

Ратавалі жывёлу

З успамінаў Лізаветы Парфіраўны Літвінавай аб эвакуацыі грамадскага статку торфапрадпрыемства «Бальшавік»

У 1941 г. я скончыла восем класаў, было мне тады 17 гадоў. 7 ліпеня 1941 г. быў атрыманы загад аб эвакуацыі насельніцтва і грамадскай маёмасці. Сем'і павінны былі ехаць цягніком, але кіраўніцтва прадпрыемства прыпазнілася, таму прынялі рашэнне адправіць жанчын з дзецьмі на конях адначасова з угонам грамадскага статку жывёлы прадпрыемства. Адказным быў прызначаны Урублеўскі Станіслаў Уладзіміравіч, былы настаўнік. Патрэбны былі добраахвотнікі, якія б згадзіліся гнаць жывёлу, клапаціцца аб ёй у дарозе, адказваць за захаванасць, карміць, паіць, даіць кароў. Адразу знайшліся жадаючыя. Сярод іх была і я, Ліза Літвінава.

Уганялі ўсю жывёлу: кароў, цялят, свіней. Статак суправаджаў ветурач Віктар Міхалькевіч. Стаяла страшэнная спякота. Свіней удалося адагнаць толькі на 4 км, пачалі дохнуць. Прыйшлося вяртацца, каб паведаміць, што гнаць далей свіней нельга. Дырэктара ўжо не было, ён пайшоў на фронт. Начальнік планавага аддзела Федасеенка, які замяшчаў дырэктара, дамовіўся з камандзірам вайсковай часці, каб свіное пагалоўе ўзялі на ежу вайскоўцам.

Разам з бацькамі, якія засталіся дома, каб атрымаць зарплату, дагналі абоз. Тут упершыню трапілі пад абстрэл. Фашысцкі лётчык на брыючым палёце расстрэльваў з кулямёта жанчын, дзяцей, старых, што крочылі па шашы. Варожыя кулі нас не зачапілі.

Са сваімі аднавяскоўцамі сустрэліся пад Веткай. Адсюль пачаўся наш цяжкі шлях, які працягваўся сорак два дні і сорак дзве ночы.

З Веткі дарога ішла праз Навазыбкаў, Клінцы, Старадуб, Унечу, Почап. Дайшлі да Дзядзькова. Там было Жардзееўскае торфапрадпрыемства Міністэрства прамбудматэрыялаў. Цяляты стаміліся, далей ісці не маглі, хоць даяркі рэгулярна даілі кароў, паілі маладняк малаком. Горка плакалі жанчыны і дзеці, гледзячы на іх. Цялят і частку аслабелых кароў здалі і рухаліся далей.

Падышлі да станцыі Івота. А тут — страшэнная бамбёжка. Фашысты наляцелі знянацку. Схавацца не было куды. За абозам, статкам рухаліся 2 паганятыя і запасны конь. Звычайна яны дапамагалі падганяць гурт. Узрывы напалохалі каня, ён вырваўся, дагнаў гурт, узнялася паніка, каровы разбегліся па лесе.

І тады Ганна Піліпаўна Арцёменка, якая ехала з сям'ёй у абозе, кінула сваіх траіх дзяцей, вярнулася ратаваць статак. Яна дапамагла сабраць кароў. Толькі пасля гэтага вярнулася да малых. Рухаліся далей. Наперадзе былі Болхаў, Мцэнск, Яфрэмаў, Ялец.

У абозе было 12 дзяцей. Іх везлі на конях, дарослыя ішлі пешшу. Даўно скончылася назапашаная з дому ежа. Калі спыняліся там, дзе вайскоўцы яшчэ не праходзілі, нам давалі хлеба, а калі хлеба не было, ішлі далей, да наступнага прыпынку. Паілі малаком дзяцей, сустрэчных салдат.

19 жніўня дабраліся да Богаяўленска Тамбоўскай вобласці, адсюль накіраваліся ў Юр'еўскі раён, у племсаўгас імя Леніна. Там здалі жывёлу.

І тут толькі падумалі аб сабе: абутак прыйшоў у непрыгоднасць, адзенне парвалася, няма даху над галавой. Было цяжка, трывожна, таміла адзінота. Але навокал былі добрыя, чулыя людзі: далі прытулак, дапамаглі. А яшчэ было адчуванне выкананага абавязку: зрабілі ўсё, што магчыма, выратавалі грамадскі статак.

Неўзабаве нас знайшлі людзі, якія эвакуіраваліся разам з прадпрыемствам «Бальшавік». Пераехалі да сваіх.

У гады вайны працавала на чыгунцы, потым на торфапрадпрыемстве. У 1945 г. вярнулася з эвакуацыі, увесь час да выхаду на пенсію працавала на прадпрыемстве «Бальшавік» майстрам па торфе, лабарантам.

Запісала Т.А.Карасік.

Акупацыйны рэжым

Пасля цяжкіх двухмесячных абарончых баёў на Гомельскім напрамку і жорсткіх двухтыднёвых баёў непасрэдна на тэрыторыі раёна і г. Гомеля злучэнні Чырвонай Арміі разам з апалчэнцамі вымушаны былі адысці на ўсход. Тэрыторыя раёна і г. Гомель былі акупіраваны нямецка-фашысцкімі захопнікамі.

Тут, як і на ўсёй захопленай тэрыторыі рэспублікі, гітлераўцы ўстанавілі жорсткі акупацыйны рэжым. Асноўны сэнс гэтага рэжыму зводзіўся да таго, каб самымі бязлітаснымі сродкамі і мерамі не дапусціць супраціўлення нашага народа, фізічна знішчыць значную частку насельніцтва краіны, а астатніх ператварыць у паслухмяных рабоў.

Яшчэ задоўга да агрэсіі верхаводы трэцяга рэйха адобрылі распрацаваны гітлераўскім апаратам план падзелу

захопленай тэрыторыі. Восенню 1941 г. падзел часова акупіраванай тэрыторыі Беларусі быў у асноўным завершаны. Яе этнаграфічную цэласную тэрыторыю, у тым ліку і Гомельшчыну, захопнікі гвалтоўна парэзалі на часткі, груба парушыўшы пры гэтым гістарычна склаўшуюся супольнасць тэрыторыі, мовы, культуры беларускага народа. Паўднёвыя раёны Гомельшчыны былі ўключаны ў рэйхскамісарыят «Украіна», астатнія — у зону армейскага тылу групы армій «Цэнтр», якія назвалі Гомельскай акругай. У гэтую акругу ўвайшлі Гомельскі, Добрушскі, Веткаўскі, Свяцілавіцкі, Чачэрскі, Уваравіцкі, Буда-Кашалёўскі і Церахоўскі раёны вобласці.

Для ажыццяўлення сваёй злачыннай палітыкі сюды прыбылі айнзацкаманды, зондэркаманды, тайная палявая паліцыя (ГФП), паліцыя бяспекі і СД, фельдкамендатуры, ортскамендатуры, жандармерыя і іншыя карныя органы. Уся неабмежаваная ўлада належала нямецкім палявым і мясцовым камендантам.

Для больш эфектыўнага ажыццяўлення сваёй злачыннай палітыкі акупанты жадалі заручыцца падтрымкай мясцовага насельніцтва. Для прыдання бачнасці мясцовага самакіравання яны стварылі марыянетачную так званую «мясцовую ўладу» — раённую ўправу на чале з бургамістрам раёна, на тэрыторыях былых сельсаветаў былі створаны валасныя ўправы на чале з бургамістрамі, у кожную вёску прызначаны старасты.

Для падтрымання свайго «парадку» і барацьбы супраць партызан і падпольшчыкаў гітлераўцы стварылі з мясцовых жыхароў, якія перайшлі да іх на службу, так званую дапаможную паліцыю парадку. Гарнізоны з такіх паліцэйскіх былі ўстаноўлены амаль ва ўсіх буйных вёсках раёна. Разам і пад кіраўніцтвам акупацыйных улад яны пачалі насаджэнне «новага парадку». У раёне пачаліся масавыя вобыскі, арышты, расстрэлы. Страшнымі мясцінамі сталі Ляшчынец і дзевяты кіламетр Чарнігаўскай шашы. Тут удзень і ўночы ішлі масавыя расстрэлы. Шмат людзей закопвалі жывымі.

Фашысты метадычна праводзілі ў раёне карныя аперацыі, спальвалі асобныя дамы і вёскі, арыштоўвалі і расстрэльвалі людзей. Перад пачаткам Вялікай Айчыннай вайны ў Гомельскім раёне было 200 вёсак. З 19 жніўня 1941 г. па канец лістапада 1943 г., пакуль раён знаходзіўся пад акупацыяй нямецкіх войскаў, было спалена поўнасцю 39 населеных пунктаў і часткова знішчана 62; 6 з іх так і не аднавіліся пасля вызвалення.

З першых дзён акупацыі фашысты прыступілі да знішчэння савецкіх мірных жыхароў, жанчын, старых, дзяцей, разбуралі, пераўтваралі ў казармы і канюшні культурна-асветніцкія цэнтры і лячэбныя ўстановы. За перыяд акупацыі Гомельскага раёна было разбурана і знішчана 62 школы, 15 з іх — сярэдніх, 11 — няпоўных сярэдніх і 36 пачатковых, будынкі сельскіх бальніц у в. Старыя Цярэшкавічы і в. Клімаўка. І хоць на спражках рамянёў у фашысцкіх салдат было напісана «З намі Бог», не лічыліся яны і з рэлігійнымі ўстановамі: наздзекаваліся над святынямі праваслаўнай царквы, рабавалі царкоўную маёмасць і абсталяванне. Так, у вёсцы Раманавічы царква была пераўтворана ў месца ўтрымання зняволеных, дзе знаходзілася пад вартай больш за 100 чалавек. Прадстаўнікамі «новага парадку» быў абадраны алтар, спалена хата святара. У в. Галавінцы была спалена хата, якая належала царкве. У в. Бабовічы немцы ў царкве разбурылі іканастас. Была спалена царква ў вёсцы Прыбыткі, узарвана царква, якая была замініравана адступаючымі фашыстамі, у

в. Ларышчава. Пры адступленні немцы спальвалі цэлыя вёскі. Так, восенню 1943 г. былі спалены вёскі Дуянаўка (27 двароў), Рудня (96 двароў), Раманавічы (236 двароў), пасёлкі Перамога, Прыазёрны, Рудня, Улукаўе, Шутаўка і іншыя.

Гітлераўцы, наводзячы «новы парадак», за малейшае падазрэнне ў нелаяльнасці або сабатажы катавалі і забівалі савецкіх людзей. Так, 21 жніўня 1941 г., на другі дзень акупацыі, быў застрэлены немцамі ва Улукаўскім сельсавеце Радыён Цуканаў, арыштаваны, а затым расстраляны Уладзімір Міхалькоў. У той жа дзень на вачах у жыхароў расстраляны Тарас Іванавіч Краўцоў з вёскі Кантакузаўка. Першапачаткова свае рэпрэсіі акупанты накіроўвалі супраць партыйных і савецкіх актывістаў. У жніўні 1941 г. былі расстраляны: сакратар Клімаўскага сельсавета Ф.Ф.Іонаў, старшыня калгаса з пасёлка Калініна М.І.Дваежанаў, калгаснік А.А.Сулейка, 12 чалавек з в. Прудок, 5 жыхароў з в. Кантакузаўка. У верасні былі расстраляны актывісты Старацярэшкавіцкага сельсавета М.Х.Готгельф, Г.П.Бартноўскі, М.Д.Сулінскі. У лістападзе карнікі расстралялі ва ўрочышчы Падліпіцкае 15 чалавек савецкага актыву з в. Бабовічы, 6 чалавек Старацярэшкавіцкага сельсавета, а ў лютым 1942 г. яшчэ траіх: Д.Дындзікава, І.Я.Архіпава, Я.Х.Астапенку. У студзені 1942 г. у в. Мільча расстраляны М.Ф.Макушкін, у кастрычніку таго ж года ў в. Раманавічы — В.Харкулёў, В.Васіленка, Ф.Майсейчыкаў. У сакавіку 1942 г. арыштаваны і расстраляны па даносе агента гестапа жыхары в. Міхалькі А.П.Леснічоў, Я.К.Цітоў, А.К.Марозаў.

У вёсцы Міхалькі немцы стварылі паліцэйскі гарнізон, падабралі паліцэйскіх, якія вылаўлівалі патрыётаў і зверскі распраўляліся з імі. Па даносе здрадніка нямецкія карнікі арыштавалі і зверскі закатавалі старшыню Карналінскага сельсавета І.І.Клімовіча, старшыню калгаса «2 Лютага» — І.Н.Клімовіча, брыгадзіра калгаса Р.М.Залатухіна і настаўніка Васільеўскай школы Ф.С.Кароўкіна. У вёсцы Рудня-Прыбыткаўская жыхары імкнуліся выказаць пратэст супраць грабяжу і ўціску. За гэта расплаціліся жыццём Ганна Грэчанава, Макар Дудараў і Павел Дудараў. У Рудні-Прыбыткаўскай таксама былі расстраляны савецкія патрыёты Баранаў, Мазураў, Казлоў, а ў вёсцы Прыбыткі — Яфім Сяды і Сцяпан Суконны. У вёсцы Клімаўка на вачах у Веры Якаўлеўны Іонавай фашысты расстралялі 5 дзяцей ад 6 да 13 гадоў, а пасля і яе. У маці Ганны Старавойтавай расстралялі 4 дзяцей ад 2 да 6 гадоў, стралялі ў Старавойтаву, але яна цудам засталася жывой. У вёсцы Пясочная Буда было замучана і расстраляна 12 мірных жыхароў. На тэрыторыі Пракопаўскага сельсавета ў вёсцы Макаўе — 10 чалавек.

У адну з карных аперацый атрад фашыстаў у складзе 100 чалавек акружыў вёскі Старыя Цярэшкавічы, Старую Бухалаўку і Высокую Грыву, забралі ўсіх мужчын (каля 300 чалавек), сагналі ў Старыя Цярэшкавічы. З іх адабралі 15 чалавек, над якімі здзекаваліся, потым дапытваліся пра партызан, але калі нічога не дамагліся, тут жа расстралялі 7 чалавек.

Ад рук фашысцкіх катаў загінула 75 чалавек (сярод якіх былі жанчыны і малыя дзеці) у Шарпілаўскім і Рудня-Марымонаўскім сельсаветах, 328 чалавек было адпраўлена ў Германію. У Васільеўскім сельсавеце фашысцкія прыслужнікі — паліцаі — знішчылі 27 чалавек, 182 — адпраўлена ў Германію. Жыхар вёскі Старая Мільча Макушын Мікалай Філіпавіч быў падвергнуты здзекам, а потым расстраля-

ны толькі за тое, што не хацеў аддаваць фашыстам сваю карову. У Красненскім сельсавеце за гады вайны было забіта і закатавана 47 жыхароў і 130 вывезена ў Германію. У Пакалюбіцкім сельсавеце расстраляна 114 чалавек, вывезена ў рабства 47.

Аб злачыннай палітыцы акупацыйных улад на тэрыторыі раёна гаворыць і такі факт. У канцы 1941 г. атрад карнікаў у вёсцы Прудок сілай зброі загнаў у школу ўсіх жыхароў. Мужчыны былі аддзелены ад жанчын. Потым з іх выбралі 12 чалавек, да вечара пратрымалі ў памяшканні, затым пад узмоцненым канвоем усіх вадзілі па хатах, каб яны развіталіся са сваімі сем'ямі. Пасля гэтага іх вывелі за вёску, паклалі тварамі ўніз у яму і расстралялі. Выпадкова застаўся жывым адзін з іх — Краўцоў Васіль Васільевіч. Цяжка паранены, ён ноччу прыпоўз дахаты і хаваўся 4 дні. Аб гэтым даведаліся гітлераўцы. Яны прыехалі ў вёску, вывелі яго з хаты і на вачах сям'і расстралялі. Такім быў «новы парадак».

Шмат гора прынеслі акупанты жыхарам Яромінскага сельсавета. Побач з рабаваннем і разбурэннямі яны расстралялі і замучылі 21 жыхара, сярод якіх былі 8 старых, 6 жанчын, 107 чалавек вывезлі ў нямецкае рабства. У вёсцы Урыцкае і пасёлку Барок былі расстраляны 17 чалавек і вывезены ў Германію 119.

Не было такога населенага пункта ў Гомельскім раёне, жыхары якога не пацярпелі б ад фашысцкіх акупантаў. Асаблівую «ўвагу» гітлераўцы аказвалі байцам і камандзірам Чырвонай Арміі, якія апынуліся на акупіраванай тэрыторыі. У Студзёнагуцкім сельсавеце пражывала 18 салдат і афіцэраў Чырвонай Арміі і 15 ваеннапалонных. Усе яны былі зверскі знішчаны.

Асабліва ўзмацніліся рэпрэсіі супраць мірных жыхароў раёна ў другой палове 1943 г. Расстрэльвалі і палілі зажыва за падазронасць у сувязі з партызанамі, за адказ эвакуіравацца ў нямецкі тыл.

У ноч на 27 верасня 1943 г. у Студзёнагуцкім сельсавеце было расстраляна і закатавана 60 чалавек, з якіх 15 спалены жывымі. Сярод іх А.Д.Лупіненка, А.Ф.Лупіненка, Н.М.Кротава і іншыя.

Асаблівае месца ў вялізным ланцугу злачынстваў фашысцкіх катаў над жыхарамі займае Урыцкі сельсавет. У пасёлку Вясёлае Поле яны ўчынілі павальныя вобыскі. Нарабаваўшы мноства рэчаў і харчоў, фашысты сабралі 14 старых і пасля жудасных катаванняў забілі іх.

У вёску Галееўка Старабеліцкага сельсавета прыбыў атрад карнікаў. Па загадзе нямецкага афіцэра 64 жыхары вёскі былі загнаны ў адну хату і спалены жывымі. Затым каты цалкам спалілі вёску Галееўка і пасёлак Аляксееўка.

Сістэматычныя здзекі, знішчэнні пагражалі ўсім жыхарам раёна на працягу ўсяго перыяду акупацыі. Толькі ў Старацярэшкавіцкім сельсавеце гітлераўцы за перыяд акупацыі здзейснілі 12 карных аперацый. Так было па ўсім раёне.

У.Ф.Эсмантовіч, Т.У.Язэпава.



Помнік на магіле ахвяр фашызму ў в. Галееўка.

Дакументы сведчаць

З ПАСТАНОВЫ НЯМЕЦКАЙ ВАЕННАЙ КАМЕНДАТУРЫ ГОМЕЛЯ АБ УВЯДЗЕННІ КАМЕНДАНЦКАГА ЧАСУ

С 1 по 30 сентября 1943 года гражданам города Гомеля и Новобелицы запрещается ходить по улицам с 7 часов вечера до 5 часов утра, в сельских местностях — с 8 часов 30 минут вечера до 4 часов утра.

Жители должны в это время находиться в своих домах. Пребывание в чужих квартирах, садах, дворах и т.п. запрещается. Не имеющие законного права нарушать данное постановление будут наказаны тюремным заключением.

Русские лица, которые по важным служебным делам находятся в запретное время вне своих домов, должны иметь ночной пропуск. Этот пропуск выдается по требованию учреждения 7 отделом комендатуры.

1. Учреждения и производства должны установить так рабочее время, чтобы служащие и рабочие могли до запрещенного времени быть дома...

В исключительно важных случаях, которые непосредственно связаны с интересами германского командования, учреждения и предприятия могут затребовать для своих служащих и рабочих выдачу ночных удостоверений из 7 отдела местной комендатуры.

2. Во время воздушной тревоги запретное время не отменяется. Гражданскому населению разрешается только дойти до ближайшего убежища и по окончанию тревоги — обратно домой. В убежище в парке, на берегу реки Сож, можно притти не позднее, как через полчаса после начала тревоги, но покидать убежище разрешается только по окончании запретного времени. Имеющим ночные пропуска разрешается в запретное время итти из убежища прямо на работу, если работа этого требует.

3. Для разъяснения даем обзор необходимых для русского населения документов.

а) Временное удостоверение (паспорт).

Все русские лица старше 14 лет должны иметь при себе временное удостоверение на немецком и русском языках или русский паспорт с регистрационной отметкой на немецком языке.

б) Справка с работы или явочная карточка.

Все жители с 14 лет до 65 лет должны иметь, кроме удостоверения личности, справку с места работы, а неработающие — явочную карточку с Биржи труда...

Для проезда между гор. Гомелем, Новобелицей, Брилевом, Хутором, Якубовкой, Костюковкой, селом Красным, Лещинцом, Любнами, Мильчей, Павловым, Прудком, Титенкой и Волотовой не нужно иметь специального проездного пропуска.

Разрешение на проезд по железной дороге дает только право проезда по железной дороге и не является пропуском. В данном случае необходимо иметь пропуск.

Комендатура.

З ЗАГАДУ № 76 НЯМЕЦКАГА ВАЕННАГА КАМЕНДАНТА ГОМЕЛЯ АБ ЗАБАРОНЕ ЖЫХАРАМ ВЫХАДУ ДА ЧЫГУНКІ

19 жніўня 1943 г.

Происшествия последнего времени требуют поставить в известность население о следующем:

1. Как уже ранее было оповещено и приказано, посторонним лицам строго воспрещается не только появление на территории жел.-дор. сооружений, но и у местности, лежащей вправо и влево в 100 метров от жел.-дор. магистрали.

2. Всем постовым отдан приказ, при неисполнении этого распоряжения, немедленно применять огнестрельное оружие.

3. При краже жел.-дор. материалов виновным грозят особо суровые наказания.

4. Местным комендатурам дано распоряжение предложить начальникам районов и бургомистрам довести его объявление до сведения населения. Кроме того, оповещение последует путем вывешивания объявления на вокзалах и установкой на особо важных жел.-дор. сооружениях специальных досок с соответствующими запрещениями.

Новый путь. 1943. 4 верасня.

З МАТЭРЫЯЛАЎ АБ ЗЛАЧЫНСТВАХ НЯМЕЦКА-ФАШЫСЦКІХ ЗАХОПНІКАЎ У ГОМЕЛЬСКІМ РАЁНЕ

АКТ

1944 года мая месяца 28 дня комиссия в составе председателя Улуковского сельского Совета Гомельского района и области Лаптухова, председателя колхоза им. Клима Ворошилова дер. Головинцы Побегаева, председателя Улуковского колхоза «Чырвоная воля» Гончарова, члена сельского Совета Годунова Василия Семеновича из поселка Победа, члена сельского Совета Рудова Василия Павловича и колхозниц Гончаровой Марии Павловны и Ганчаровой Анны Емельяновны при участии Прокурора Гомельского района Фирсова составила акт о зверствах немецко-фашистских захватчиков в период оккупации в населенных пунктах Улуковского сельского Совета и установлено, что немцы вступили в населенные пункты Улуковского сельского Совета 1941 г. 21 августа и парализовали мирный труд населения. Фашисты грабили население, издевались над людьми, насиловали девушек, а яйцо и сало отбиралось у мирных граждан повальными обысками.

При продвижении немецких войск 22 августа 1941 г. Цуканов Родион спрятался в яму и был застрелен немцем.

У Михалькова Владимира был обнаружен обрез и несколько патронов, его избили дома. Избиение носило характер пыток, ему приписывали связь с партизанами. Михальков ничего не сказал. Он был арестован, заключен в тюрьму, а затем расстрелян.

В период хозяйствования на территории Улуковского сельского Совета немецкие фашисты наряду с мобилизацией на рытье окопов, противотанковых рвов, оборонительных сооружений проводили мобилизацию и угоняли на каторгу в Германию.

ім ніякіх харчоў. Замест хлеба і сала — вілы ў бок подламу фашысту. Замест малака і мяса кулю ў яго чорнае сэрца. Прыводзьце ў нягоднасць станкі і абсталяванне прадпрыемстваў! Выводзьце са строю паравозы, зрывайце рух эшалонаў на фронт, не давайце вывозіць наша дабро ў фашысцкую Германію». Лістоўкі друкаваліся не толькі для насельніцтва акупіраванай тэрыторыі, але і для салдат арміі працiўніка. Гэта паднімала баявы дух насельніцтва, аказвала ўплыў на далейшае разгортванне барацьбы супраць фашысцкіх акупантаў.

Станоўча ўплывала на мясцовых партызан і падпольшчыкаў дзейнасць разведвальна-дыверсійных груп, якія былі накіраваны ў тыл ворага камандаваннем Чырвонай Арміі, НКДБ, НКУС. Такія групы дзейнічалі на тэрыторыі Гомельскага раёна. На чале адной з іх стаяў разведчык В.С.Залезей (мянушка «Гром»).

З лета 1942 г. у наваколлі Гомеля дзейнічаў спецатрад НКДБ «Наперад», камандзірам якога быў П.Г. Шамякін. З 4 мая па 18 жніўня ў Гомельскім раёне дзейнічала дыверсійная група Б.Х. Тульчынскага, якой за гэты час было праведзена 18 дыверсій на чыгункы, 15 на шашы. Разам з мясцовымі партызанскімі атрадамі група прымала ўдзел у барацьбе супраць паліцэйскіх і карнікаў.

Шырокую дыверсійную дзейнасць праводзіла спецгрупа «Радзіма» пад камандаваннем маёра М.Ф. Філімонава, група Галоўнага разведвальнага ўпраўлення Генштаба Чырвонай Арміі пад камандаваннем І.І. Баравіцкага (падпольная мянушка «Вера»).

У жніўні 1943 г. у гомельскія лясы прыбыла спецгрупа НКДБ БССР «Бывалыя» на чале з капітанам М.І. Шыбекам.

Асаблівыя надзеі гітлераўскае камандаванне ўскладала на летняе наступленне сваіх войскаў у 1943 г. Бітва на Курскай дузе — а менавіта тут разгортваліся галоўныя падзеі — скончылася бліскучай перамогай савецкіх войскаў. Дзяржаўны камітэт абароны і ЦК ВКП(б) патрабавалі ад партызан і падпольшчыкаў узмацніць барацьбу ў тыле працiўніка, разбураць яго камунікацыі, падрываць чыгуначныя масты, зрываць перакідванне варожых войскаў, падвоз зброі і боепрыпасаў, узрываць і падпальваць ваенныя склады і нападаць на варожыя гарнізоны, усімі сродкамі аказваць дапамогу наступаючай Чырвонай Арміі.

Сустрэча былых партызан атрада імя Будзённага, ветэранаў Вялікай Айчыннай і грамадзянскай войнаў з Улукаўскага сельсавета.

Пачынаючы з лета 1943 г., партызаны актывізавалі барацьбу на камунікацыях ворага. У жніўні пачынаецца знакамітая «рэйкавая вайна». Толькі партызанамі Гомельскага злучэння было падарвана 7 тысяч рэек. У вёсцы Прудок былі падарваны 2 гарматы і больш за 1000 снарадаў. Усё гэта аказвала вялікую дапамогу Чырвонай Арміі. У лютым — ліпені 1944 г. у в. Чонкі базіраваўся Беларускі штаб партызанскага руху.

У.Ф.Эсмантовіч, Т.У.Язэпава.

Дакументы сведчаць

СА СПРАВАЗДАЧЫ САКРАТАРА ГОМЕЛЬСКАГА ПАДПОЛЬНАГА ГАРКОМА КАМСАМОЛА С.КУПЦОВА

«...Раньше чем установить адреса в Гомеле, я подобрал сеть агентурных работников (связных) от места расположения отряда до Гомеля и с помощью их начал отыскивать гомельчан с советскими настроениями, изучать состояние дел на пути и в городе. По ту сторону Днепра (отряд стоял за Днепром) — левый берег — агентами были в д. Балашевка — комсомолка Дробышевская Мария (позже ушла в бригаду Пономаренко), в д. Доброволец — Сенчук Ганна, в д. Милоград — комсомолка Гребенчук Зина. На эту сторону Днепра — к Гомелю (левый берег) в д. Черное — комсомолка Семукова Люба, в д. Репнице — комсомолка Грицкова Надя, в д. Решетники — Кирикова Галина (принята в комсомол на бюро ГК 16 августа 1943), в д. Задоровка — Ковалева Лидия, в д. Галеевка — комсомолка Лебежкова Феня, в д. Телеши — Шафранская Наташа и ее подруга Устинья (фамилию забыл), в д. Залипье — Назарова Женя, в д. Мильча — Абросимава Нина.

Все они имели для работы цифровые пароли и условные места свиданий. Это первые люди, с которых начиналось осуществление задания...»

Секретарь Гомельского подпольного городского комитета ЛКСМБ (С.Купцов).
22.12.1943 г.

Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. Ф. 3334. Воп. 1. Спр. 7. Л. 2.

ДАВЕДКА АБ ПАРТЫЙНА-КАМСАМОЛЬСКІМ ПАДПОЛЛІ ВЁСКІ МІХАЛЬКІ ГОМЕЛЬСКАГА РАЁНА Ў ГАДЫ ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЫ

жнівень 1941 — чэрвень 1942 гг.

Комиссия Гомельского райкома КПБ по изучению партийно-патриотического подполья, действовавшего в годы Великой Отечественной войны, изучив документы и воспоминания бывших партизан, установила, что в селе Михальки Гомельским райкомом КПБ в августе 1941 года была создана инициативная группа для организации борьбы в тылу врага. В состав этой группы входили: Морозов Тит Федорович — председатель колхоза им. Сталина, Матвеенко Никита Ефимович, чл. ВЛКСМ с 1935 года, местный житель; Бурый Клим Васильевич — объездчик Макеевского лесничества, проживавший на страже «Лесничевка». Последнему командованием Гомельского партизанского отряда «Большевик» была поручена также охрана забазированного в урочище «Лесничевка» оружия и боеприпасов.

В течение августа — сентября 1941 года в подпольную организацию были вовлечены свыше двадцати пяти советских патриотов. Ядро организации составляли бывшие бойцы отряда самообороны.

В сентябре на совещании в урочище «Лесничевка» инициативная группа решала организационные вопросы. Командиром комсомольской молодежи, входящей в состав подпольной организации, был назначен Матвеенко Никита Ефимович, а подпольщиков старших возрастов возглавил Морозов Тит Федорович. Обе группы в целях конспирации должны были действовать самостоятельно, а координация действий обеих групп поручалась Буром Климу Васильевичу, имевшему связь с командованием отряда «Большевик» (см. воспоминания Морозова Т.Ф., л. 2).

В состав группы Морозова Т.Ф. входили Матвеенко А.И., Пугачев В.Н., Морозов А.А., Морозов А. К., Морозова А.Т., Морозов П.Д., Дедкова М.П., Кириенко Е.П., Пугачев М.Н.

В состав молодежной группы Матвеенко Н.Е. вошли: Матвеенко В.А., Матвеенко И.Е., Матвеенко С.Ф., Матвеенко Г.И., Морозов И.Т., Морозов С.П., Тишков Е.К., Каменкова М.И., Морозова Е.П., Тимошенко Илларион Маркович.

Ближайшими помощниками Бурова Клима Васильевича в подпольной антифашистской деятельности стала вся его семья в составе жены Александры Миновны, дочери комсомолки Лидии, сыновей Василия и 12-летнего Владимира.

На страже «Лесничевка» был установлен радиоприемник, по которому практиковалось слушание Московских радиопередач, составление листовок и размножение их на пишущей машинке. Печатал листовки сын Бурова Василий и доставлял их в село Михальки.

В первые месяцы антифашистская деятельность подпольщиков сводилась к сбору оружия на местах былых боев и распространению листовок в соседних селах и поселках.

При создании местных органов оккупационных властей подпольщикам удалось выдвинуть на должность старосты села Михальки своего человека Лесничева Арсения Павловича и писарем Титкова Евгения Кирилловича. Последние обеспечивали подпольщиков бланками пропусков и удостоверений личности немецкого образца. Во время арестов советских активистов староста принимал меры к их освобождению.

С согласия старосты подпольщики спрятали в лесу до двух тонн колхозного зерна для передачи его партизанам.

В сентябре 1941 года на связь с подпольщиками прибыл секретарь Гомельского горкома комсомола т. Купцов Сергей Павлович. Встреча состоялась в доме Каменковой Марии Игнатьевны в поселке. Купцов С.П. поставил перед подпольщиками задачу на развертывание диверсионной деятельности. С этого времени обе группы начали подрывать и сжигать мосты на дорогах, повреждать линии связи. Ими было уничтожено семь мостов, спилены столбы телефонной связи на протяжении 4 километров от д. Дятловичи до Рудни Маримоновой. На шоссе Гомель – Речица подпольщики из группы Морозова подорвали автомашину, в результате чего погибло 10 вражеских солдат.

Фашистская контрразведка усилила внимание к деревне Михальки, начала вербовать среди ее жителей тайных агентов. Одним из агентов СД стал Гапоненко С.Д. Первым его предательством был донос на старосту Лесничева А.П. и писаря Титкова Е.К., которые «передали партизанам колхозное зерно». В конце марта 1942 года полиция арестовала старосту, писаря и лесника Морозова Остапа Карповича. Их зверски мучали при допросе и расстреляли в лесу за селом. Через несколько дней были арестованы и после жестоких пыток расстреляны Кириенко Ефим Прохорович и Пугачев Михаил Никитич.

Подпольщики решили отомстить за смерть павших товарищей. Молодежной группе было поручено забросать гранатами полицейский участок. Диверсия готовилась в день приезда начальника карательного отряда и другого «начальства» с Гомеля. Однако в молодежной группе кто-то проговорился о диверсии своему товарищу Героимову Н.Г., а тот донес в полицию. В результате за день до диверсии прибыли каратели из Гомеля и начались аресты. Полиция арестовала Матвеенко Н.Е., Матвеенко В.А., Матвеенко И.Ф., Матвеенко С.Ф., Морозова И.Т., Морозова С.П., Титкова Е.К., Морозову Е.П., Тимошенко И.М., Матвеенко Г.И.

Арестованных публично истяза-

Помнік падпольшчыкам у в. Міхалькі Даўгалескага сельсавета.

ли возле школы, пытаясь узнать имя руководителя группы. Подпольщики отрицали существование организации. Тогда им скрутили руки и погрузили в машину для отправки в гомельскую тюрьму. По пути в Гомель Матвеенко Никита Ефимович сумел развязать себе руки, помог освободить руки рядом сидящему Сергею Матвеенко и на лесной дороге оба выпрыгнули из кузова машины. Конвоиры открыли огонь, но преследовать не решились, опасаясь побега остальных арестованных.

С помощью гомельских подпольщиков из тюрьмы удалось бежать Семену Морозову. Ефросинью Морозову из тюрьмы отправили на каторжные работы в Германию, Груню Матвеенко отпустили домой под надзор полиции в надежде установить ее связи с партизанами. Остальные пятеро подпольщиков были казнены в застенках СД.

Через два дня, т.е. 10 июня 1942 года были арестованы Матвеенко А.И., Пугачев В.Н., Морозов А.А., Морозова А.И. Первые трое расстреляны, а четвертая заточена в концлагерь.

Руководитель группы Морозов Т.Ф. избежал ареста потому, что еще в начале мая перешел на нелегальное положение и проживал в лесу. Вместе с Бурым К.В. и его сыном Василием Морозов Т.Ф. ушел в партизанский отряд «Большевик». Жена Бурого Александра Миновна, дочь Лидия и сын Владимир еще раньше были арестованы в деревне Огородня-Гомельская и брошены в концлагерь. Из всего подполья вне подозрений остались только Каменкова М.И. и Дедкова М.П., которые до дня освобождения области являлись связными Гомельской партизанской бригады.

Подпольщики села Михальки после разгрома полицейского участка намеревались создать партизанский отряд. Однако подлая рука изменника сорвала эти планы. Большинство патриотов погибло в страшных муках, до конца оставаясь верными матери-Родине, а те, кому удалось избежать арестов, мужественно дрались с фашистскими захватчиками в Гомельском партизанском соединении.

Комиссия. Председатель. Члены.

Падпольшчыкі з вёскі Заліп'е ✓

Восенню 1941 г. у пахмырны дзень, які хіліўся ўжо да надвячорка, воддаль вёскі Заліп'е ў гушчары прытаіліся з вінтоўкамі дружбакі — Федзя Кузюкоў, Коля Волкаў і яго дваюрадны брат Лука Волкаў. Яны заляглі ў старых акопах непадалёк ад дарогі, якая вяла з вёскі Урыцкае на Гомель. Хлопцы чакалі, калі наблізіцца нямецкі абоз, які вез у горад салому. І вось вялізныя фурманкі, запрэжаныя парамі дужых коней, з адкрытага поля сталі павольна ўязджаць у хвойнік. Калі сярэднія вазы апынуліся насупраць засады, раздалося некалькі залпаў. Немцы ад нечаканасці пападалі на мерзлую зямлю, на адной фурманцы загарэлася салома. Пакуль салдаты схамяніліся і адкрылі беспарадкавы агонь з аўтаматаў, хлопцаў і след прастыў.

Так у лістападзе 1941 г. тры камсамольцы вёскі Заліп'е Урыцкага сельсавета ўчынілі першую ўзброеную вылазку супраць нямецка-фашысцкіх акупантаў. Іх не спалохала тое, што за захоўванне зброі фашысты каралі смерцю, што за паўмесяца да гэтага карнікі першым у вёсцы расстралялі Івана Антонавіча Пічукова — былога калгаснага брыгадзіра, партызана і інваліда грамадзянскай вайны.

Вось з гэтай баявой тройкі і пачыналася падпольная камсамольска-маладзёжная група, якая была створана ў вёсцы Заліп'е вясной 1942 г. Узначаліў яе Фёдар Кузюкоў, 1921 г. нараджэння, які працаваў да вайны правадніком вагона на прыгарадным поездзе. Адразу пасля нападу фашысцкай Германіі на СССР Фёдар стаў чырвонаармейцам. Пры адступленні ён трапіў у акружэнне і прабраўся дадому, але зброі не склаў. Мікола і Лука Волкавы, нядаўнія школьнікі, былі на два гады маладзей за яго. У падпольную групу ўвайшлі таксама Рыгор Лукіч Масцярской, які да вайны працаваў чыгуначнікам у Гомелі, і яго дзевятнаццацігадовы сын Лёнька, камсамолец, былы вучань сярэдняй школы. Бацька стаў гаспадаром явачнай кватэры, якая аб'ядноўвала вясковых падпольшчыкаў.

Згуртаваць падпольную групу дапамагала Жэня Назарава — сястра Мікалая Волкава. Муж яе Даніла ваяваў на фронце, а яна адразу ж пасля нашэсця акупантаў у 1941 г. стала сувязной Гомельскага падпольнага гаркома камсамола. Жэня жыла разам з маці і братам, у іх хаце была створана адна з явачных кватэр гарадскіх падпольшчыкаў, якія каардынавалі свае

дзеянні з партызанамі. Заліпскія падпольшчыкі распаўсюджвалі лістоўкі, зводкі Саўінфармбюро, якія перадавала ім праз брата сувязная Жэня. Разам з іншымі вернымі сябрамі яны збіралі і захоўвалі зброю, якая засталася ў наваколлі пасля адступлення савецкіх войскаў.

Дзеля канспірацыі падпольшчыкі дамовіліся нідзе на людзях не набліжацца адзін да аднаго. Перасцярога была недарэмная, бо ў вёсцы знайшліся здраднікі. Гэта ж яны і выдалі на расправу актывіста І.А.Пічукова. Адзін з нямецкіх паслугачоў па мянушцы «Хобат» падаўся ў паліцыю. Ён удзельнічаў у карных аперацыях супраць партызан і мірных жыхароў, вынюхваў антыфашыстаў і ў сваёй вёсцы.

Восенню 1942 г. фашысты схапілі некалькі заліпскіх жыхароў, у тым ліку падпольшчыкаў Фёдара Кузьміча Кузюкова і Луку Яўсеевіча Волкава. Здраднік данёс, што яны захоўваюць зброю. Разам з іншымі арыштаванымі іх расстралялі. Трагічна абарвалася жыццё вясковага веселуна, прыгажуна, на якога заглядваліся дзяўчаты, кіраўніка групы Федзі Кузюкова. Страшэнна катавалі фашысты яго сябра Луку Волкава, дужага хлопца, падобнага на асілка. Пра гэта даведаліся пасля родзічы ад аднаго жыхара вёскі Давыдаўка, якога прымусілі немцы закопваць трупы расстраляных. Калі 6 лістапада 1942 г. фашысты прывезлі людзей на расстрэл у лес, усё цела Лукі Волкава пад парванай бялізнай было акрываўленае, уяўляла суцэльную рану. Раптам ён рвануўся з месца і пабег. Карнікі адкрылі наўздагон агонь, але прамахнуліся. На вялікі жаль, Лука не змог выратавацца ад смерці. Ён наскочыў на іншых немцаў, якія прыгналі ваеннапалонных нарыхтоўваць лес і пачулі страляніну. Варожая куля напаткала яго.

Вясной 1943 г. група адрадзілася. Пасля правалу яе ўзначаліў Мікалай Сцяпанавіч Волкаў. У сакавіку — красавіку 1943 г. ён папоўніў яе новымі сіламі, прыцягнуўшы ў падполле сваіх верных сяброў. Замест двух загінуўшых у рады падпольшчыкаў сталі Яўген Масцярской, яго дваюрадны брат Віктар Жосткін, Дзмітрый Балдачоў — усе яны 1922 г. нараджэння, Уладзімір Волкаў і Іван Траянаў, якім не было яшчэ поўных 17, а таксама шаснаццацігадовы Жора Масцярской, малодшы сын гаспадара явачнай кватэры. Трагічны правал групы восенню 1942 г. не спыніў патрыётаў — даваенных школьнікаў. За выключэннем аднаго, усе былі камсамольцамі.

Падпольшчыкі актывізавалі сваю дзейнасць. Яны здабывалі разведвальныя даныя аб дыслакацыі нямецкіх войскаў, вялі агітацыю сярод моладзі — заклікалі яе ўступаць у рады народных мсціўцаў, зрывалі адпраўку на работу ў Германію. Лістоўкі і зводкі расклейвалі не толькі па вёсцы, але і перад домам старасты. Сувязная падпольнага гаркома камсамола Жэня Назарава дастаўляла з партызанскай зоны таксама газету «Правда», часопіс «Раздавім

Былыя падпольшчыкі Яўген Масцярской, Георгій Масцярской і Мікалай Волкаў каля хаты, якая ў гады вайны была явачнай кватэрай. Студзень 1995 г.

фашысцкую гадзіну!». Усё гэта праз яе брата, кіраўніка групы Мікалая Волкава трапляла ў рукі падпольшчыкаў, а ад іх — аднавяскоўцам, якія нібы атрымлівалі глыткі свежага паветра ад вестак з Вялікай зямлі, даведваліся аб становішчы на франтах, аб тым, як савецкі народ і яго армія б'юцца з ворагам. У людзей з'яўлялася надзея на вызваленне з-пад гітлераўскай няволі.

Падпольшчыкі шмат увагі ўдзялялі здабыванню зброі. Разам з Мікалаем Волкавым у 1941 г. у яе зборы ўдзельнічалі Уладзімір Волкаў і Дзмітрый Балдачоў, якія жылі па-суседску з ім, а таксама Яўген Масцярской. Калі яны ўліліся ў рады падпольшчыкаў, зброя гэта згадзілася па прамым прызначэнні — знішчаць ненавісных акупантаў. І не толькі ім, а і партызанам, з якімі падпольная група трымала цесную сувязь.

З ліпеня 1943 г. маладыя патрыёты выконвалі заданні партызанскай брыгады імя Шчорса Гомельскага злучэння. Партызанскай брыгадзе, якой камандаваў Байкоў, заліпскія падпольшчыкі перадалі 11 вінтовак, звыш 7 тысяч патронаў, два ручныя кулямёты, дзве скрынкі ўзрыўчаткі, нават скрынку мінамётных мін (з іх выплаўлялі тол для дыверсій на чугунцы). Усё гэта па ўсіх правілах было складзена ў дашчаных скрынках і захоўвалася ў зямлі за старымі могілкамі ў хвойніку.

Частку зброі з гэтай схованкі падпольшчыкі пакінулі сабе, яна патрэбна была ім для правядзення баявых аперацый.

Патрыёты ўсё часцей выходзілі на баявыя заданні. У сувязі з узмацненнем і расшырэннем партызанскіх дзеянняў ва Урыцку ў школе размясціўся паліцэйскі гарнізон.

Неўзабаве партызаны аднаго з атрадаў праніклі ноччу ў яго, знішчылі паліцаяў. Выратавацца ўдалося толькі двум немцам, якія спалі ў асобным пакоі і паспелі ўцячы ў адных падштаніках ў Заліп'е.

Калі пачалася бітва на Курскай дузе, заліпскія падпольшчыкі атрымалі заданне выйсці на чыгунку. Мікалай Волкаў з партызанскай зоны прынёс у кошыку міну, якую перадала дэсантніца. Яна і навучыла, як закладваць яе. Назаўтра, 12 ліпеня, на заданне ў лес з ім пайшлі сярод белага дня Яўген Масцярской, Віктар Жосткін, Уладзімір Волкаў і Іван Траянаў.

Небяспечна было паказвацца на чыгунцы і нават каля яе. Апрача таго, што чыгунка ахоўвалася, з кожнага боку шырынёй на 50 метраў ад палатна быў спілаваны і ўбраны лес. Хлопцы занялі зыходную пазіцыю ў гушчары. Вось два мадзьяры, адзін з якіх пасвіствуў, прайшлі з аўтаматамі міма па шпалах у напрамку паста, дзе на вышцы з біноклем знаходзіўся ўзброены вартавы. Потым праімчаліся два паравозы, счэпленыя разам, а неўзабаве за імі праскочыў чыгуначны бранявік. Калі ён ад'ехаў, Мікалай і Уладзімір Волкавы пад прыкрыццём сваіх сяброў падпаўзлі да чыгункі. Агледзеўшыся, заклалі міну ў якіх ста метрах ад вышкі і вярнуліся паўзком на месца.

Момант быў выбраны ўдала, калі ахова страціла пільнасць, бо толькі што па чыгунцы бесперашкодна прайшлі лакаматывы і бранявічок. А падрыўнікі тым часам хваляваліся, ці з'явіцца эшалон, а калі з'явіцца, ці спрацуе міна? Нарэшце пачуўся грукат цягніка, які ішоў ад станцыі Прыбар на Гомель. Здавалася хлопцам, што секунды цягнуцца вельмі доўга. Але як толькі колы паравоза наехалі на правадкі міны, паветра страсянулася ад моцнага выбуху. Варожы эшалон з жывой сілай і артылерыяй паляцеў пад адхон. Доўга пасля таго не было руху цягнікоў на тым участку.

Не ў сілах справіцца з партызанамі фашысцкія вылюдкі, наводзячы жах, жорстка распраўляліся з мірным насельніцтвам. У 1943 г. яны спалілі жывымі 87 чалавек у вёсках Галееўка, Аляксееўка і Вясёлае Поле, якія прымыкалі да партызанскай зоны.

Успамінаючы тыя далёкія часіны, Мікалай Волкаў гаварыў: «Я нібы хадзіў па лязу брытвы, быў увесь напружаны, як сціснутая спружына». Падпольшчыкі рызыкавалі не толькі сабой, але і жыццём блізкіх. Кіраўнік жа групы ўсведамляў сваю адказнасць за іх усіх. Аднак вера ў правату сваёй справы надавала патрыётам мужнасць і стойкасць. Юныя мсціўцы не маглі дараваць няпрошаным заваёўнікам смерць і разбурэнні, якія яны прынеслі на нашу зямлю. Падпольшчыкі рабілі ўсё, што было ў іх сілах, каб хутчэй вызваліць родны край ад чужынцаў.

Восенню 1943 г. фронт наблізіўся да Гомеля. Вёску Заліп'е , якая знаходзілася на

захад ад горада, запоўнілі адступаючыя немцы. Падпольшчыкі атрымалі з партызанскага штаба загад пакінуць вёску, бо ўжо нельга было тут заставацца. У ноч на 22 верасня амаль усе члены групы перайшлі ў партызанскі атрад «За Савецкую Беларусь» брыгады імя Шчорса, якая базіравалася ў суседнім Рэчыцкім раёне. Браты Лёнька і Жора Масцярскія засталіся на месцы для сувязі. Мікалай Волкаў, Яўген Масцярской, Уладзімір Волкаў, узброеныя вінтоўкамі, пісталетамі і гранатамі, пад прыкрыццём ночы вывезлі на падводах у партызанскую зону свае сем'і.

Віктара Жосткіна, Мікалая Волкава, Яўгена Масцярскога і Уладзіміра Волкава залічылі ў брыгадную разведку далёкага дзеяння.

Аднойчы Яўген і Віктар разам з разведчыкам Ігарам Падальніцкім каля падыходу да партызанскай зоны чакалі з Гомеля дзяўчат — сувязных. Раптам паказалася падвода, на якой ехалі шэсць узброеных паліцаяў. Як высветлілася, яны, пачуўшы няладнае, вырашылі здацца партызанам, каб змыць сваю віну. На ўсякі выпадак хлопцы іх абяззброілі. І тут Яўген нечакана аднаго з іх апазнаў. Восенню 1942 г. ён разам з немцамі і здраднікам Хобатам, з якім служыў сумесна, удзельнічаў у арышце Яўгена і яго аднавяскоўцаў. Партызанскае камандаванне асобна занялося гэтым перабежчыкам, які спадзяваўся застацца нявінным, хаця і яго рукі былі ў крыві расстраляных падпольшчыкаў і іншых жыхароў Заліп'я.

Шмат было цяжкіх партызанскіх баёў і паходаў. Многае выпала на долю народных мсціўцаў. Пад вёскай Горваль партызаны трапілі ў блакаду. З вялікімі стратамі вырваліся па балотах з акружэння карнікаў, перайшлі Днепр. Потым, пасля чатырохсутачных баёў, пераправіліся праз раку назад, адбілі ў ворага пакінутую тэрыторыю.

Нарэшце 19 лістапада 1943 г. тры партызанскія брыгады злучыліся з Чырвонай Арміяй. Каля вёскі Азершчына партызаны пад прыкрыццём савецкіх воінаў перабраліся хто на чым на правы бераг Дняпра да сваіх. Радасць была бясконцая. Доўгачаканая, хвалюючая сустрэча на вызваленай зямлі з часцямі 65-й арміі праслаўленага генерала Батава кожнаму запомнілася на ўсё жыццё.

Назаўтра партызан размеркавалі па палках і падраздзяленнях. І зноў баі, зноў атакі і наступленні. Заліпскія хлопцы, загартаваныя суровымі выпрабаваннямі ў тыле ворага, сталі ваяваць у радах Чырвонай Арміі, у кровапралітных схватках працягвалі барацьбу за вызваленне роднага краю. Атлетычнага складу Віктар Піліпавіч Жосткін выказаў жаданне пайсці ў дывізіённую разведку. У 1944 г. ён загінуў геройскай смерцю пад Жлобінам.

Яўген Іларыёнавіч Масцярской трапіў у кулямётны разлік. Пры наступленні ў сакавіку 1944 г. на Парычы быў цяжка паранены. Пасля пяці шпітальных месяцаў восенню прыехаў дадому. Адкрывалася рана, і ў наступным годзе яму далі другую групу інваліднасці. За ратныя подзвігі Я.І.Масцярской узнагароджаны ордэнам Айчыннай вайны I ступені, медалямі «За адвагу», «За баявыя заслугі».

Мікалай Сцяпанавіч Волкаў спачатку ваяваў радавым, зведаў цяжкія зацяжныя баі ў балоцістых лясах пад Парычамі і Азарычамі, дзе быў паранены. Амаль тры месяцы шпіталя, і зноў на перадавую. У сакавіку 1944 г. малодшы сяржант Мікалай Волкаў камандаваў аддзяленнем аўтаматчыкаў. Летам таго ж года, пасля вызвалення Баранавіч, у час атакі зноў быў паранены. У верасні пасля лячэння гвардыі сяржант вярнуўся ў строй. Да дэмабілізацыі ў 1947 г. служыў памочнікам камандзіра ўзвода.

М.С.Волкаў — кавалер ордэнаў Айчыннай вайны II ступені, Славы III ступені, узнагароджаны медалямі.

Дзмітрый Сямёнавіч Балдачоў пасля злучэння партызан з савецкімі войскамі таксама прайшоў цяжкімі франтавымі дарогамі. Першае асколачнае раненне атрымаў пры штурме Кёнігсберга. Потым было яшчэ адно. А трэці раз яму дасталіся некалькі снарадных асколкаў пад Берлінам. Пасля шпіталя інвалідам трэцяй групы ён прыехаў дадому, маючы баявыя ўзнагароды.

У мірныя дні былыя падпольшчыкі, партызаны, салдаты не шукалі сабе палёгкі. Як і ўсе ветэраны, у цяжкія пасляваенныя гады цярпліва аднаўлялі разбураную гаспадарку, залечвалі раны роднай зямлі, за вызваленне якой не шкадавалі жыцця.

І.І.Пічукоў.

Змагаліся разам з вучнямі

Ішла восень 1941 года. Фронт да гэтага часу ўжо адкаціўся далёка на ўсход ад Гомеля. Кіламетраў за 25 на поўнач ад горада жыхары в. Сямёнаўка, якую перасякае шаша на Доўск, кастрычніцкім днём убіралі бульбу за вёскай. Нечакана ўсе, хто працаваў у полі, памкнулі позіркі ў неба. Яны ўбачылі, як падае савецкі самалёт, падбіты ў паветраным баі. І раптам на вачах вяскоўцаў у вышыні раскрыўся парашут. Людзі з трывогай чакалі, што будзе з лётчыкам, асабліва калі заўважылі на шашы немцаў і паліцаяў, якія з'явіліся на яго пошукі. Да вечара прачэсвалі карнікі кусты на балоце, але так і не знайшлі ні пілота, ні парашута.

Сярод жанчын на бульбяным полі знаходзілася тады і Праскоўя Хамянкова, якая выкладала беларускую мову і літаратуру ў Сямёнаўскай сямігодцы. Пад покрывам ночы Праскоўя і яе сяброўка Надзея Саўціна адправіліся на балота, дзе і знайшлі параненага лётчыка, якога Праскоўя вырашыла схаваць дома ў сваёй маці ў в. Іванаўка Цярэніцкага сельсавета. Амаль тры тыдні выходжвалі лётчыка патрыёткі разам з маці Анастасіяй Мінаўнай. А калі ачуняў, сабралі яго ў дарогу. Выратаваны лётчык пайшоў з нямецкага тылу на ўсход да лініі фронту.

Помнік камсамольцам-падпольшчыкам каля Узаўскай сярэдняй школы. Правобразам дзяўчыны-патрыёткі паслужыла настаўніца П.Хамянкова.

Праскоўя Трафімаўна яшчэ да выратавання лётчыка ўключылася ў падпольную дзейнасць. Яна вяла антыфашысцкую прапаганду, распаўсюджвала лістоўкі сярод насельніцтва, арганізавала нелегальную камсамольскую работу з моладдзю. Таму і затрымалася ў Сямёнаўцы, каб прыгледзецца да сваіх былых вучняў, даведацца, як паводзяць яны сябе пры акупацыі, а там і далучыць да падпольнай барацьбы. І сярод іх знайшлося нямала сапраўдных патрыётаў-аднадумцаў. Пасля сустрэч і гутарак з рабятамі настаўніца ўпэўнілася, што яе выхаванцы не зломлены духам, што яны гатовы змагацца супраць фашыстаў.

Былыя вучні дапамаглі ёй адрамантаваць радыёпрыёмнік, па якім начамі слухалі зводкі Савецкага інфармбюро. На сядзібе маці Праскоўі Трафімаўны ў в. Іванаўка яны абсталявалі тайнік. Там настаўніца і друкавала на пішучай машынцы лістоўкі са зводкамі, якія прымалі па радыё з Масквы. А юныя памочнікі распаўсюджвалі іх сярод жыхароў навакольных населеных пунктаў. Так даходзілі да людзей весткі аб становішчы на франтах, гераізме воінаў Чырвонай Арміі і працаўнікоў савецкага тылу.

Падпольная камсамольска-маладзёжная арганізацыя расла. У ёй ужо аб'ядналася каля 30 чалавек. Душой і кіраўніком арганізацыі была Праскоўя Трафімаўна Хамянкова. А сакратаром камсамольскай арганізацыі выбралі Івана Канцавога. Калі пачалася Вялікая Айчынная вайна, ён, 18-гадовы юнак, стаў у рады воінаў. Але ў час цяжкіх баёў трапіў у акружэнне і дабраўся дадому. Адной з актыўных падпольшчыц, сувязной настаўніцы стала Надзея Сауціна.

На месцах былых баёў маладыя патрыёты знаходзілі зброю. Паступова ў тайніках аказалася 5 скрынь толу, дзве каробкі дэтанатараў, рацыя, два кулямёты, каля 30 вінтовак, больш 50 гранат, пісталеты, шмат

патронаў. І тады падпольшчыкі стварылі ўзброеную групу, у якую спачатку ўвайшлі 5 чалавек. Гэта Леанід Кавальскі, Іван Канцавы, Іван Сіўцоў, Васіль Капралаў і Аляксандр Кабкоў. З цягам часу група расшырылася, у ёй ужо налічвалася каля 20 юных падпольшчыкаў. Камандзірам узброенай групы выбралі Леаніда Кавальскага, сяржанта Чырвонай Арміі, які таксама выбраўся з акружэння і спыніўся ў Сямёнаўцы. Яшчэ ў жніўні яго падраздзяленне трымала абарону каля гэтай вёскі, і тады ён пазнаёміўся тут з дзяўчынай. А цяпер, восенню, яна прытуліла акружэнца ў сваёй хаце. Камісарам групы стала Праскоўя Хамянкова. І вось настаў суровы час, калі настаўніца і яе вучні разам змагаліся супраць ворагаў, якія прынеслі смерць і разбурэнне на нашу зямлю. Другую ўзброеную групу з дванаццаці чалавек узначаліў Уладзімір Калашнікаў.

Падпольная арганізацыя ахоплівала сваёй дзейнасцю шэраг населеных пунктаў былога Уваравіцкага раёна. У тым ліку пасёлкі торфазавода «Бальшавік», вёскі Іванаўка, Калінаўка, Старая Беліца, Зялёныя Лукі, якія адносяцца да Гомельскага раёна, вёскі Сямёнаўка (цяпер Калініна), Рудзянец, Ціхінічы, Асобіна, станцыя Уза, што ўвайшлі ў Буда-Кашалёўскі раён.

Быў пад пільнай увагай падпольшчыкаў і адрэзак чынункі ад Касцюкоўкі да Радзеева, дзе яны ажыццяўлялі дыверсіі. Першая вылазка баявой групы адбылася непадалёк ад цяперашняга Касцюкоўскага СПТВ-179. Кіраваць аперацыяй узяўся Леанід Кавальскі. Разам з ім пайшлі да чыгункі Іван Канцавой, Іван Сіўцоў, Васіль Капралаў і Аляксандр Кабкоў. Разведку і падрыхтоўку яны правялі загадзя. І калі сцямнела, занялі зручную агнявую пазіцыю ў хмызняку каля насыпу чыгуначнага палатна. Ва ўсіх былі вінтоўкі. І вось стаў набліжацца нямецкі састаў з бензінам.

— Страляць па маёй камандзе. Пасля трэцяга залпу адыходзім! — загадаў Кавальскі.

Як толькі перад хлопцамі паказаліся цыстэрны, тройчы з невялікімі інтэрваламі прагучалі стрэлы. Праз прабоіны з цыстэрн, якія ішлі на фронт, выліваўся бензін. Каля станцыі Радзеева ў абстрэле цыстэрн удзельнічалі 10 падпольшчыкаў з выкарыстаннем не толькі вінтовак, але і ручнога кулямёта, аўтамата.

Падпольшчыкі ўстанавілі сувязь з чыгуначнікамі, якія працавалі на станцыі Уза. Праз стрэлачніка Ігната Ягоравіча Сіўцова перадалі ім узрыўчатку. А праз дзень на той станцыі былі ўзарваны паравоз і некалькі цыстэрн з палівам. На чыгункі каля вёскі Ціхінічы сябры-патрыёты з Узы падарвалі нямецкі воінскі эшалон. Узрыўчатку ім перадала група, якую ўзначальваў Уладзімір Калашнікаў. Ён і сам удзельнічаў у той аперацыі.

Падпольшчыца Ефрасіння Дударава, былая старшая піянерважатая Сямёнаўскай школы, выратавала жыццё траім цяжка параненым чырвонаармейцам. Яна хавала іх на гарышчы сваёй хаты, даглядала і лячыла. Потым яны пайшлі прабірацца на ўсход. Падпольшчыца Аляксандра Беланожка (Дударава) і яе маці таксама хавалі і як маглі лячылі ў сваім доме цяжка параненага савецкага байца. Гэта быў Яўген Андрэевіч Баравой, якога ў верасні 1941 г. у непрытомным стане падабралі жанчыны ў кустах каля шашы.

Акупанты прымушалі мясцовых жыхароў вазіць з торфазавода «Бальшавік» торф на электрастанцыю ў Гомель. Падпольшчыкі засоўвалі ў торф замаскіраваную ўзрыўчатку. Аднойчы ад выбуху выйшаў са строю кацёл электрастанцыі. Пад бокам у нямецкай камендатуры, якая знаходзілася ў пасёлку торфазавода, падпольшчыкі спалілі на балоце некалькі штабялёў торфу.

Патрыёты імкнуліся ўстанавіць сувязь з партызанамі, каб далучыцца да іх. Па заданні арганізацыі некаторыя з іх хадзілі на пошукі партызан у прыдняпроўскія і чачэрскія лясы. Але безвынікова. Нарэшце іванаўскаму настаўніку-камсамольцу Яўмену Літвінаву ў пачатку чэрвеня 1942 г. удалося звязацца з партызанамі ў Рэчыцкім раёне. Дамовіліся аб плане хуткага пераходу ўзброеных хлопцаў у атрад. Аднак не наканавана было збыцца задуме падпольшчыкаў.

Іх выдаў здраднік, які назваў прозвішчы 24 чалавек. Пачаліся арышты. Спачатку іх трымалі ва Уваравічах, а затым — у гомельскай турме. Цяжкія катаванні, жудасныя здзекі фашысцкіх вылюдкаў выпалі на долю падпольшчыкаў, якія трапілі за турэмныя краты. Асабліва па-зверску расправіліся карнікі з кіраўнікамі і больш актыўнымі членамі арганізацыі.

У нядзелю 14 чэрвеня 1942 г. у вёсцы Сямёнаўка фашысты павесілі каля школы Івана Канцавога, Аляксандра Кабкова, Івана Сіўцова і Леаніда Кавальскага. Віселі яны на шыбеніцы да 10 гадзін наступнага дня. Пахаваць на могілках нямецкія ўлады не дазволілі. Таму іх паклалі ў брацкую магілу насупраць, каля чыгункі.

Праз некалькі дзён ад рук фашысцкіх карнікаў загінулі Праскоўя Хамянкова, яе маці Анастасія Мінаўна Хамянкова, Яўмен Літвінаў, якіх схапілі ў Іванаўцы, Васіль Капралаў, Леанід Шапоцька, Анатоль Губанаў, Мікалай Гладуноў, Уладзімір Калашнікаў, Аляксандр Скарына, Мікалай Скарына, Рыгор Цурбанаў, Анатоль Сяргеенка, Іван Стольнікаў. Яны былі расстраляны ў Гомелі і ў ляску каля Давыдаўкі.

Трагічна і рана абарваліся жыцці патрыётаў. Яны загінулі з верай у перамогу над фашысцкімі захопнікамі.

У 1967 г. па ініцыятыве ветэрана Вялікай Айчыннай вайны Сцяпана Цімафеевіча Пігулеўскага, які працаваў дырэктарам Рудзянскай сярэдняй школы Буда-Кашалёўскага раёна, на магіле чатырох павешаных падпольшчыкаў быў устаноўлены помнік.

С.Ц.Пігулеўскі да вайны жыў у Сямёнаўцы, быў асабіста знаёмы з Праскоўяй Хамянковай, многімі яе выхаванцамі. Будучы дырэктарам школы, ён узначальваў атрад «Пошук». Пад яго кіраўніцтвам юныя следапыты сабралі шматлікія матэрыялы аб дзейнасці падпольнай арганізацыі.

8 мая 1976 г. у вёсцы Іванаўка Цярэніцкага сельсавета была ўстаноўлена мемарыяльная дошка на доме, дзе нарадзілася 20 кастрычніка 1918 г. і выраслa Праскоўя Хамянкова. Вуліцу Гомельскую, на якой знаходзіцца яе дом, выканком сельсавета перайменаваў у вуліцу Праскоўі Хамянковай. А ў 1981 г. у пасёлку чыгуначнай станцыі Уза ўзведзены помнік мужнай падпольшчыцы і яе баявым сябрам. У скульптурнай кампазіцыі — высокая фігура дзяўчыны ў поўны рост, якая ў выцягнутай угору руцэ ўзняла факел, сімвал барацьбы за свабоду.

Ім жа прысвечана і дакументальная аповесць Адама Сцепаненкі «Да апошняга дыхання», выпушчаная выдавецтвам «Беларусь» у 1975 г.

І.І.Пічукоў.

Партызанскія фарміраванні

БРИГАДА «БОЛЬШЕВИК»

Создана в октябре 1943 г. приказом уполномоченного ЦК КП(б)Б по Гомельской области на базе отдельного отряда «Большевик». При формировании бригады из выделенного им личного состава организованы отряды «Патриот Родины» и им. В.П.Чкалова.

Бригада действовала в Гомельском, Чечерском, Речицком, Добрушском, Ветковском, Светиловичском, Кормянском, Лоевском районах.

Соединилась с частями Красной Армии 23 ноября 1943 г. в составе 3 отрядов общей численностью 531 партизан.

Из них:
мужчин — 488
женщин — 43
белорусов — 286
русских — 175
украинцев — 38
других нац. — 32
членов ВКП(б) — 44
кандидатов — 22
членов ВЛКСМ — 130
беспартийных — 335

Командир бригады — Гамарко Иван Федорович
октябрь 1943 — ноябрь 1943

Комиссар — Поляничко Василий Никитич
октябрь 1943 — ноябрь 1943

ОТРЯД «БОЛЬШЕВИК»

Образован 17 августа 1941 г. Гомельским горкомом КП(б)Б из партийно-советского актива города (42 чел.). После оккупации района, 19 августа, отряд приступил к партизанским действиям. В сентябре 1941 г. к нему присоединился Ново-Белицкий отряд (организован в августе 1941 г.; командир — Г.И. Климович, комиссар — В.В.Юдин, начальник штаба — К.Ф.Шаров), в мае 1942 г. влился Гомельский сельский отряд (организован в августе 1941 г.; командир — А.Ф. Бурый, комиссар — С.И.Шулдиков).

Отряд «Большевик» до середины мая 1942 г. действовал в составе северной группы отрядов Гомельской области, затем — южной.

На день соединения с частями Красной Армии насчитывал 234 партизана.

Командиры отряда:
Федосеенко Илья Степанович
август 1941 — август 1943
Гамарко Иван Федорович
август 1943 — октябрь 1943
Ценебриченко Павел Иванович
октябрь 1943 — ноябрь 1943

Комиссары:
Антонов Семен Федорович
август 1941 — сентябрь 1941
Барыкин Емельян Игнатьевич
сентябрь 1941 — ноябрь 1942
Балховитин Афанасий Михайлович
ноябрь 1942 — июль 1943
Поляничко Василий Никитич
август 1943 — октябрь 1943
Эркин Гриша Насонович
октябрь 1943 — ноябрь 1943

Начальники штаба:
Лисовский Бенедикт Дмитриевич
август 1941 — ноябрь 1941
Юдин Вячеслав Васильевич
сентябрь 1942 — март 1943

У распалажэнні партызанскага атрада «Бальшавік». У цэнтры партызан В.С.Цакуноў.

Трунов Иван Павлович
октябрь 1943
Бердников Василий Николаевич
октябрь 1943 — ноябрь 1943

Партизанские формирования Белоруссии в годы Великой Отечественной войны. Мн., 1983. С. 397—398.

На месцы партызанскага лагера непадалёку ад в. Чонкі.

Баявая рэліквія брыгады

Сярод баявых рэліквій, якія захоўваюцца ў абласным краязнаўчым музеі, — сцяг партызанскай брыгады «Бальшавік». Як з'явіўся сцяг у праслаўленай брыгадзе, успамінае былы падпольшчык, сакратар Гомельскага падпольнага ГК ЛКСМБ Купцоў Сяргей Паўлавіч.

...У 1943 г. у партызанскую брыгаду «Бальшавік» прыйшоў з Рэчыцы піянер Валодзя Мельнікаў і прынёс чырвонае палотнішча. Каб зрабіць баявы сцяг, як гэта належыць, двухбаковым, вырашылі пафарбаваць у чырвоны колер і выкарыстаць для гэтай мэты палатно з шоўку.

Хто зробіць вышыўку на сцягу? Камандзір брыгады І.Ф.Гамарка і камісар В.М.Палянічка запрасілі ў штаб камсамольцаў. Падпольшчыцы-партызанкі Тамара Грабенчук, Марыя Доўгая, Ганна і Еўдакія Серыкавы ўзяліся вышываць сцяг. Працавалі не ведаючы стомы, з раніцы да позняй ночы. З гільзы 45-міліметровага снарада зрабілі медны наканечнік, падрыхтавалі дрэўка — сцяг гатоў.

...У лагеры падаецца баявы сігнал. Узводы, роты, атрады становяцца ў шарэнгі. Адкрываецца мітынг. Начальнік штаба злучэння Е.І.Барыкін па даручэнні падпольнага абкома і гаркома партыі ва ўрачыстай цішыні ўручыў сцяг брыгадзе. Пад гэтым сцягам народныя мсціўцы грамілі гарнізоны нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Пад гэтым сцягам партызанскія атрады брыгады «Бальшавік» дапамагалі войскам 1-га Беларускага фронту фарсіраваць Днепр, вызваляць родную зямлю ад акупантаў.

З фондаў Гомельскага абласнога краязнаўчага музея.

Дакументы сведчаць

З ЗАГАДУ ПА ГОМЕЛЬСКІМ ПАРТЫЗАНСКІМ АТРАДЗЕ «БАЛЬШАВІК» АБ БАЯВЫМ РАХУНКУ АТРАДА ЗА ПЕРЫЯД З 15 ЖНІЎНЯ 1941 г. ПА 7 СНЕЖНЯ 1942 г.

7 снежня 1942 г.

«За 17 месяцев отряд увеличил свои ряды в семь раз. За этот же период бойцы, командиры и политработники отряда проделали следующую боевую работу: спущено 11 воинских железнодорожных эшелонов противника, из них — 4 эшелона с войсками, 2 эшелона с боеприпасами, 2 эшелона с боевой техникой, 1 эшелон с горючим и автозапчастями, 1 эшелон с продовольствием и 1 эшелон с углем. В результате крушений повреждено 13 паровозов, разбито 42 вагона с войсками, 32 вагона с боеприпасами, 37 платформ с боевой техникой, 6 цистерн с горючим, 7 вагонов с автозапчастями, 13 вагонов с продовольствием, 17 вагонов с углем. Разбито 18 автомашин противника с войсками и военным имуществом, следовавших на фронт. Разбиты и потоплены на реке Сож газоход и баржа с продовольствием и обслуживающей прислугой из немцев. Сожжено и уничтожено 28 мостов на шоссейных и грунтовых дорогах и 6 мостов на железной дороге. Уничтожено 12 километров телефонно-телеграфной связи. Разгромлено и уничтожено 7 волостных управ и 9 полицейских участков. Истреблено 249 гитлеровцев (кроме погибших при крушении поездов) и 127 полицейских, волостных и сельских старост и немецких шпионов».

Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. Ф. 3500. Воп. 4. Спр. 199. Л. 26.

Падрыхтаваў да друку У.І. Лемяшонак.

Помнік у гонар Беларускага штаба партызанскага руху, в. Чонкі.

З АПЕРАТЫЎНЫХ ЗВОДАК САВЕЦКАГА ІНФАРМБЮРО

за 13 ліпеня 1943 г.

Командир партизанского отряда, действующего в Гомельской области, получил сведения о том, что на одной станции ожидается в ближайшее время прибытие немецкого поезда с танками. Партизаны заминировали железнодорожное полотно управляемыми фугасами и засели в укрытие. Вначале прошел состав с порожняком, затем поезд с лесоматериалами. Наконец, показался ожидаемый эшелон. Когда он проходил по заминированному участку, подрывники включили ток. Взрывом разбиты паровоз и 11 платформ. Находившиеся на них танки приведены в полную негодность. Группа партизан отряда «За Родину» сожгла немецкий самолет, сделавший вынужденную посадку.

за 16 ліпеня 1943 г.

Партизаны отряда «Большевик», действующего в Гомельской области, в ночь на 2 июля проникли в расположение артиллерийского склада немцев. Партизаны заминировали складские помещения и быстро скрылись. Через несколько минут раздался взрыв огромной силы. Немецкий склад боеприпасов взлетел на воздух. На следующий день группа подрывников этого же отряда пустила под откос 2 воинских эшелона противника, следовавших к линии фронта. В результате крушений разбиты 2 паровоза и 53 цистерны с горючим.

за 24 ліпеня 1943 г.

Партизанский отряд, действующий в одном из районов Гомельской области, пустил под откос два немецких эшелона с танками и орудиями. Более суток гитлеровцы очищали путь от обломков разбитых вагонов, поврежденных танков и орудий. На другой линии железной дороги партизаны отряда «Большевик» подорвали на минах немецкий воинский поезд.

З ЗАПІСУ ГУТАРКІ СТАРШАГА ПАМОЧНІКА НАЧАЛЬНІКА 2-га АДДЗЕЛА БШПР З КАМАНДЗІРАМ ДЫВЕРСІЙНАЙ ГРУПЫ Б.Х.ТУЛЬЧЫНСКІМ АБ ДЗЕЙНАСЦІ ГРУПЫ

5 студзеня 1943 г.
г. Масква

Вопрос: Расскажите о действиях и организации вашей диверсионной группы?

Ответ: По заданию разведотдела штаба Западного фронта наша группа была выброшена десантом в ночь с 3 на 4 июня 1942 г. в Гомельском районе. В основном наша задача заключалась в диверсии и разведке обороны г. Гомеля. Действовали на всех коммуникациях в Гомельском районе, на шоссейных и железных дорогах.

6 июня возле разъезда Прибор, на дороге Речица — Гомель пустили под откос первый эшелон. Было уничтожено 3 вагона с артиллерией, 10 вагонов с боеприпасами и 3 вагона с живой силой.

9 июня на шоссе Речица — Гомель подорвали 3 автомашины — 2 легковые и 1 грузовую с солдатами. Перехватили почтовую корреспонденцию.

11 июня взорвали и уничтожили 2 автомашины и 1 мотоцикл с боеприпасами и солдатским составом.

12 июня в район, где мы находились, пришли представители партизанского отряда: Кожар, Барыкин, Юдин (секретарь Новобелицкого райкома партии) и бойцы отряда. Они предложили мне перейти в расположение отряда. С этого времени я все время находился в гомельском отряде «Большевик». При отряде диверсионных групп не было. С моим приходом в отряд были организованы диверсионные группы, которые вместе с моими людьми приступили к работе. Место дислокации отряда было в 3 км западнее Шарпиловки. В 4 км западнее Шарпиловки находился отряд под командованием секретаря Лоевского райкома партии тов. Дундукова. Комиссаром отряда был Синяков. В настоящее время Дундуков находится в Клетнянских лесах в соединении Федорова.

22 июня 1942 г. в. 1,5 км северо-западнее дер. Зябровка на ж.д. Гомель — Бахмач моя группа пустила под откос эшелон с живой силой. Количество уничтоженных вагонов установить не удалось. По данным разведки [в эшелоне] было 300 чел., из числа которых было много раненых. Сколько убито, неизвестно.

3 июля на ж.д. Речица — Гомель вели* бой с отрядом, охраняющим железную дорогу. Убили 5 чел. чехов. С нашей стороны потерь нет.

---

* В документе «имели».

4 июля 1942 г. восточнее разъезда Прибор на ж.д. Речица — Гомель пущен под откос эшелон с боеприпасами и живой силой противника. Уничтожено 6 вагонов с боеприпасами, 4 вагона с продовольствием и 1 вагон с офицерским составом.

4 июля 1942 г. на шоссе Речица — Гомель взорваны 2 машины с людским составом. Потери противника не установлены.

11 июля 1942 г. юго-восточнее дер. Холмы на ж.д. Гомель — Чернигов пущен под откос эшелон. Уничтожено 11 вагонов с людским составом.

18 августа на ж.д. Гомель — Чернигов юго-восточнее дер. Холмы пущен под откос поезд с техникой противника. Уничтожено 8 вагонов.

Во всех этих случаях паровозы также пошли под откос. Было произведено 18 взрывов ж.-д. полотна и 15 взрывов на шоссейных дорогах. Кроме того, действовали с партизанскими отрядами против полицейских и карателей.

Вопрос: Что Вам известно о состоянии самого г. Гомеля (коммунальное хозяйство, промышленность)?

Ответ: Сам город в большинстве разрушен. В здании стекольного завода им. Сталина работают автомонтажные мастерские немцев. Сам стекольный завод не работает.

По состоянию на 20 октября заводы «Гомсельмаш», им. Кирова, жиркомбинат, фабрика «Спартак» не работали. Лесокомбинат в Новобелице работает с перерывами, по мере поступления лесоматериалов. Электростанция не работала и электросвета в городе не было. Имелись данные о том, что ведется подготовка к открытию электростанции.

Высшие учебные заведения в городе не работают.

Об организации торговли и снабжения в городе мне неизвестно, за исключением того, что железнодорожники получают по 300 г хлеба на рабочего и 100 г на иждивенца. В июле месяце 1942 г. отпуск хлеба иждивенцам был прекращен.

До августа месяца работал лесопильный завод в Омельковщине Полесской обл. В августе месяце завод сожжен партизанами...

Вопрос: Что вы можете сказать о состоянии землепользования в районах Гомельской обл., о поставках и налогах?

Ответ: Земля была распределена среди крестьян. Общественного землепользования колхозов и совхозов нет. На совхозных землях земские хозяйства. Такое земское хозяйство организовано на землях совхоза «Максим Горький». Возглавлял это хозяйство местный староста. В настоящее время сюда прибыл взвод немцев, которые работают. Других земских хозяйств я не знаю. Земля распределена подворно, количество едоков не учитывается. Лишены земли семьи партизан. Семьи красноармейцев землю получили. Фактов выхода крестьян на хутора нет.

Поставки следующие: на каждый двор определяется количество хлеба с гектара. О размере поставок натурой сказать не могу. Но знаю, что натуральные поставки большие. О денежных налогах с хозяйства не знаю. Денежный налог есть за собаку — 150 руб., за кошку — 75 руб.

Вопрос: Какую работу проводят партизанские отряды среди населения?

Ответ: Основная работа партизан среди населения заключалась в выпуске листовок и сообщений информбюро. Сообщения информбюро принимали по радиоприемнику, записывали от руки и распространяли среди населения. Выпускали такие обращения к полицейским и другим лицам, ушедшим на службу к немцам. Выпускали обращения к населению не идти в добровольческие отряды. Среди населения проводили собрания в деревнях. Особенно проводили работу по вопросу несдачи поставок немецким властям.

Листовок и газет из советского тыла наши отряды не получали. Когда мы опустились с десантной группой, то у летчиков было немного листовок ЦК КП(б)Б. О газете «Советская Белоруссия» там ничего не было известно до моего приезда.

Вопрос: Существует ли резервная армия партизан?

Ответ: Да, существует. Есть в деревнях люди, которые получают задание командования отряда и работают. Каждый отряд имеет таких людей. В каждой деревне примерное количество их 20—30 чел., которые даже имеют оружие. При занятии деревни эти люди переходят в отряд.

Вопрос: Какое политическое настроение населения в городе и деревне?

Ответ: Основная масса населения настроена за советскую власть. Население симпатизирует партизанам, в нужный момент прячет партизан от карателей. Население прячет хлеб,

скот угоняет в лес, сообщает партизанам о прибытии немцев. Население верит нашим листовкам и ждет прихода Красной Армии.

Активная помощь населения выражается в том, что, когда немцы хотят забрать скот, то население отдает его партизанам. Были случаи, когда население приходило и говорило, что там-то находятся немцы, с тем, чтобы мы их разбили.

Вопрос: Что Вам известно о настроении чехов, находящихся на службе у немцев?

Ответ: Мы с чехами наладили связь через одну девушку-партизанку и получали через нее письма от чешского офицера в отряд Кожара. Связь с каждым днем стала улучшаться. Наша разведка стала смелее действовать и заходила в места расположения чехов. Чехи партизан не трогали, предупреждали о полицейских. Однажды в дер. Омельковщина приехали чехи для борьбы с партизанами. 3 чеха поили лошадей у колодца. Наши разведчики с ними разговаривали. Чехи предупредили разведчиков: «Здесь полицейские, не ходите».

Такие же встречи бывали нередко. Однажды мы в деревне собирали продукты, и чехи тоже. Мы с чехами встретились, поздоровались. Иногда чехи дают нам патроны. Были случаи перехода чехов на нашу сторону. Например, 1 чех перешел и потом еще 2 с легковой автомашиной.

Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. Ф. 4. Воп. 33а. Спр. 9. Л. 29,32,38.

Падрыхтаваў У.І.Лемяшонак.

Настаўнік-партызан

Акім Маркавіч Рабека вучыў моладзь быць сумленнымі, мужнымі, вернымі патрыётамі сваёй Радзімы, гатовымі, калі спатрэбіцца, аддаць за яе сваё жыццё.

У 1937 г. ён стаў дырэктарам Галавінскай няпоўнай сярэдняй школы Улукаўскага сельскага Савета. У работу ўкладаў усяго сябе, быў сапраўдным педагогам. Сеяць бы яму разумнае, добрае, вечнае ў думках юнакоў і дзяўчат, выпускаць іх на вялікую жыццёвую дарогу. Ды толькі фашысцкая навала перашкодзіла рабіць гэта. Па заданні ЦК КП(б)Б і Гомельскага сельскага райкома партыі А.М.Рабека застаўся ў тыле ворага. Ён быў у складзе 42 чалавек, з якіх у жніўні 1941 г. быў арганізаваны партызанскі атрад «Бальшавік». Атрад павялічваўся, мужнеў.

У баях з гітлераўцамі не раз вызначаўся сваёй мужнасцю і адвагай партызан А.М.Рабека. Па расказах былых членаў Гомельскага падпольнага гаркома КП(б)Б Е.І.Рамбаева, А.Н.Несцяровіча, сакратара партбюро партызанскага атрада М.Дз.Кротава, палітрука атрада К.Ф.Шарава і іншых, гэта быў камуніст, які не ведаў страху ў барацьбе з ворагам.

Адважны партызан удзельнічаў у разгромах варожых гарнізонаў, падрывах эшалонаў, хадзіў у разведку, дабываў каштоўныя даныя. У чэрвені 1942 г. група партызан знішчыла канвой гітлераўцаў, захапіла баржу і кацер, якія ішлі па рацэ Сож у раён вёскі Шарпілаўка. Партызаны захапілі вялікія трафеі: зброю, боепрыпасы, тону сметанковага масла, 100 тон бульбы, 38 тысяч яек. Значную частку харчоў народныя мсціўцы раздалі мясцовым жыхарам. Калі камандзір атрада «Бальшавік» І.С.Федасеенка падводзіў вынікі паспяхова праведзенай аперацыі, сярод найбольш вызначыўшыхся ў баі партызан ён назваў Акіма Маркавіча. І зноў новыя баі, смяротныя сутычкі з ворагам.

У сакавіку 1943 г. у складзе групы М.Дз.Кротава А.М.Рабека праводзіў збор сродкаў у насельніцтва вёсак Рэчыцкага раёна на пабудову танкавай калоны. Сабраныя грошы былі накіраваны ў Гомельскі штаб партызанскага злучэння для адпраўкі на Вялікую зямлю. Акім Маркавіч зарэкамендаваў сябе ўмелым агітатарам. Ён праводзіў сярод партызан гутаркі, палітінфармацыі, палымяным словам натхняў народных мсціўцаў на подзвігі ў імя Радзімы.

Не давялося адважнаму партызану дажыць да радаснага дня вызвалення Гомельшчыны. 14 красавіка 1943 г. ён загінуў у баі з нямецкімі карнікамі.

У грозныя для Радзімы гады Акім Маркавіч сам паступіў так, як вучыў сваіх выхаванцаў.

М.Царкоў.

Партызанская сям'я

